Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
ДУА «Інстытут культуры Беларусі»

*ЗАЦВЯРДЖАЮ*
*Намеснік Міністра культуры*
*Рэспублікі Беларусь*

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

ТЫПАВАЯ ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА
для ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў галіне культуры і мастацтва па спецыяльнасці 2-17 01 01 «акцёрскае мастацтва»

Інбелкульт
Мінск • 2011

*Укладальнік* ***Грушэўскі М. М.,*** выкладчык установы адукацыі «Віцебскі дзяржаўны каледж культуры і мастацтваў»

*Рэцэнзент* ***Шырокава Я. І.,*** ст. выкладчык кафедры гуманітарных дысцыплін установы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў»

Разгледжана і адобрана на пасяджэнні цыклавой камісіі агульнаадукацыйных дысцыплін
УА «Віцебскі дзяржаўны каледж культуры і мастацтваў»
(пратакол № 5 ад 15.01.2010 г.)

© Укладанне. Грушэўскі М. М., 2011
© Арыгінал-макет. Інбелкульт, 2011

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма па гісторыі беларускай літаратуры выклікана рэаліямі нашага часу, новай канцэпцыяй літаратурнай адукацыі.

У курсе «Гісторыя беларускай літаратуры» вылучаны чатыры часткі: «Літаратура XI — першай паловы XVII стагоддзя», «Літаратура другой паловы XVII — XVIII стагоддзя», «Літаратура XIX стагоддзя», «Літаратура XX — пачатку XXI стагоддзя». Такі падзел абумоўлены як гісторыяй народа, так і эвалюцыяй мастацкага мыслення, месцам і роляй літаратуры ў грамадскім жыцці.

Праграма арыентуе на пазнанне праз мастацтва слова духоўных і маральных агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей, разуменне ролі літаратуры ў прагрэсе чалавецтва, на творчы, самастойны і ўсвядомлены характар засваення, індывідуальна-асобасны падыход да навучання.

Курс «Гісторыя беларускай літаратуры» будуецца на гісторыка-літаратурнай аснове і адлюстроўвае змены асноўных эпох нацыянальнага мастацтва.

Аснову вучэбнага курса складаюць літаратурныя творы, якія адбіраліся паводле іх мастацкіх якасцей, агульначалавечай значнасці, выхаваўчага патэнцыялу, месца, якое яны займаюць у творчасці пісьменніка і гісторыі літаратуры.

**Мэты курса** — пазнаёміць навучэнцаў з нацыянальным літаратурным працэсам; даць уяўленне пра агульныя напрамкі развіцця літаратуры, змены ў ёй мастацка-светапоглядных сістэм, эвалюцыю метадаў, стыляў, жанравых форм; прааналізаваць жыццёвы і творчы шлях пісьменнікаў, змест іх твораў, месца і ролю ў літаратурным працэсе.

**Задачы курса:**

- даць навучэнцам рознабаковыя веды па дысцыпліне;
- даць уяўленне аб месцы беларускай літаратуры ў сістэме еўрапейскіх і сусветных літаратурных каштоўнасцей;
- навучыць арыентавацца ў свеце мастацкіх з'яў;
- выпрацаваць навыкі аналізу літаратурнага твора;
- выхоўваць эстэтычны густ, адчуванне прыгожага ў жыцці і літаратуры;
- выпрацаваць уменне весці абгрунтаваны дыялог па пытаннях вывучанага матэрыялу.

Праграма складаецца з аглядных і манаграфічных раздзелаў. У аглядных даецца агульная характарыстыка пэўнага перыяду, вылучаюцца асноўныя тэндэнцыі ў творчасці пісьменнікаў, раскрываецца ўплыў грамадска-палітычных падзей на літаратуру. Манаграфічна прапануецца вывучаць спадчыну класікаў — Ф. Скарыны, Ф. Багушэвіча, Я. Коласа, Я. Купалы, М. Багдановіча, І. Мележа, В. Быкава, І. Шамякіна і інш. (на выбар выкладчыка), а таксама творчасць мастакоў слова, што заявілі пра сябе як яркія індывідуальнасці, вызначылі мастацкі ўзровень літаратуры свайго часу і абумовілі ў многім далейшыя шляхі яе развіцця.

Магчыма пераразмеркаванне выкладчыкам гадзін па тэмах.

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзел, тэма | Колькасць гадзін |
|---|---|
| **УВОДЗІНЫ** | **1** |
| **ЛІТАРАТУРА БЕЛАРУСІ XI — ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XVII СТАГОДДЗЯ** | **8** |
| Літаратура XI — XIII стагоддзяў | 3 |
| Літаратура XIV — пачатку XVI стагоддзя | 1 |
| Літаратура XVI — першай паловы XVII стагоддзя | 4 |
| **ЛІТАРАТУРА БЕЛАРУСІ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XVII — XVIII СТАГОДДЗЯ** | **2** |
| Абавязковая кантрольная работа | **1** |
| **ЛІТАРАТУРА БЕЛАРУСІ XIX СТАГОДДЗЯ** | **4** |
| Літаратура першай паловы XIX стагоддзя | 1 |
| Літаратура другой паловы XIX стагоддзя | 3 |
| **ЛІТАРАТУРА БЕЛАРУСІ XX — ПАЧАТКУ XXI СТАГОДДЗЯ** | **16** |
| Літаратура пачатку XX стагоддзя | 5 |
| Літаратура 20—30-х гг. XX стагоддзя | 2 |
| Літаратура Заходняй Беларусі | 1 |
| Літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага часу | 1 |
| Літаратура 60—80-х гг. XX стагоддзя | 5 |
| Літаратура канца XX — пачатку XXI стагоддзя | 2 |
| **Усяго** | **32** |



# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## УВОДЗІНЫ
(1 гадзіна)

Мэты і задачы курса.

Этапы станаўлення і развіцця сусветнай культуры. Беларуская літаратура і культура ў сусветным працэсе. Перыядызацыя літаратурнага працэсу. Асноўныя кірункі, стылі, жанры мастацкай літаратуры.

## ЛІТАРАТУРА БЕЛАРУСІ XI — ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XVII СТАГОДДЗЯ
(8 гадзін)

### Літаратура XI — XIII стагоддзяў
(3 гадзіны)

Спецыфіка старажытнай літаратуры, яе вытокі, тэматыка, паэтыка, перыядызацыя. Эвалюцыя славянскага пісьма. Дзве групы помнікаў: царкоўнага пісьменства і свецкай літаратуры. Старажытнаруская і старaславянская мовы ў літаратурных помніках. Роля Кірылы і Мяфодзія ў станаўленні і развіцці мовы. Гістарычны лёс беларускай літаратуры, еднасць з культурай Візантыі, Еўропы.

Старажытная Русь, яе ўздым і заняпад. Полацкае, Турава-Пінскае і Смаленскае княствы як гістарычная прарадзіма беларусаў, калыска іх культуры.

***Перакладная літаратура.*** Пранікненне ў Старажытную Русь літаратурных помнікаў візантыйскага і паўднёваславянскага паходжання, іх засваенне і перапрацоўка. Распаўсюджанне на Беларусі ў славянскіх перакладах кніг Евангелля, Псалтыра, Апостала, царкоўных песень і малітваў (Тураўскае Евангелле, XI ст.).

Апокрыфы. Тыпалогія, падзел на старазапаветныя, новазапаветныя і жыційныя. Беларускія спісы апокрыфаў («Сон Багародзіцы», «Аб дванаццаці пакутах», «Загадкі цара Давіда», «Страцім-птах»). Іх уплыў на перакладныя аповесці і раманы Сярэднявечча, распаўсюджанне ў фальклоры, выкарыстанне ў літаратуры XX ст.

***Арыгінальная літаратура.*** Яе хуткі ўзлёт, развіццё вядучых жанраў (жыціі, казанні, пропаведзі, летапісы). Агіяграфія. Жыціі Барыса і Глеба; Феадосія Пячорскага; Аўраамія Смаленскага; Кірылы Тураўскага; Аляксея, чалавека Божага; Еўфрасінні Полацкай. Аб'ектыўная і справядлівая ацэнка святой апякунні Беларускай зямлі навукоўцаў, літаратараў і святароў нашага часу (А. Мельнікаў, М. Ермаловіч, У. Арлоў і інш.). Уплыў «Жыція Еўфрасінні Полацкай» на развіццё агіяграфічнага жанру ў беларускай літаратуры. Спалучэнне ў ім рытарычнага ўступу, пахвалы, генеалогіі роду з паэтыкай хаджэнняў.

Хаджэнні. Спецыфіка жанру. Апісанне падарожжаў да святынь Палесціны і Візантыі. «Хаджэнне ігумена Даніїла». Яго змест, месца ў «паломніцкай» літаратуры.

Летапісы. «Аповесць мінулых гадоў». Жанравая разнастайнасць «Аповесці...». «Жаніцьба Уладзіміра на Рагнедзе», «Прыняцце Уладзімірам хрысціянства», «Аб барацьбе полацкіх князёў», «Прамова Іаана Полацкага», «Пра цудоўнае здарэнне ў Полацку», «Павучанне Уладзіміра Манамаха» ў Лаўрэнцьеўскім спісе «Аповесці...». Полацкі летапіс XII ст. Гістарычныя запісы ў Навагрудку і Пінску (XIII ст.).

***Клімент Смаляціч*** (? — пасля 1164). Біяграфічныя звесткі. Адказы ў так званых «пытаннях Кірыка Новагародца». «Пасланне смаленскаму прэсвітэру Фаме». Ідэі няхцівасці, перавагі духоўнага над матэрыяльным.

***Кірыла Тураўскі*** (каля 1130 — каля 1182). Казанні, павучанні, малітвы, каноны. Жанравая спецыфіка «Слоў», іх тэматыка і кампазіцыя («Слова на вербную нядзелю», «Слова на Фаніну нядзелю»). Рытарычныя тырады, маналогі. Народная лексіка. Прытчы пра беларызца і пра чарняца, пра чалавечую душу і пра цела і інш.

***«Слова пра паход Ігаравы».*** Адкрыццё і вывучэнне помніка. Гістарычныя факты і падзеі ў «Слове...», іх адпаведнасць летапісным звесткам пра паход князя Ігара на полаўцаў. Жанравая прырода «Слова...». Мастацкая маляўнічасць. Язычніцкая міфалогія. Фалькларызм. Паэтыка галашэнняў (плач Яраслаўны). Сістэма вобразаў. Вобраз полацкага князя Усяслава Чарадзея. Пераклады «Слова...» на беларускую мову.

Пераход ад агульнага пісьменства Старажытнай Русі да самастойных рускай, беларускай і ўкраінскай літаратур (XIII—XIV стст.).



## Літаратура XIV — пачатку XVI стагоддзя
(1 гадзіна)

Беларусь у складзе Вялікага Княства Літоўскага. Статус беларускай мовы як дзяржаўнай. Дамінуючая роля ў эканоміцы і палітыцы беларускіх магнатаў (Радзівілаў, Хадкевічаў, Валовічаў, Сапегаў і інш.).

***Летапісанне***. Смаленскі летапіс XIV — пачатку XV ст., летапісы XV—XVI стст. Летапісныя зводы: «Летапісец вялікіх князёў літоўскіх», «Беларуска-літоўскі летапіс 1446 года», «Хроніка Вялікага Княства Літоўскага і Жамойцкага», «Хроніка Быхаўца». Летапісныя аповесці аб дзеяннях вялікіх князёў — Міндоўга, Войшалка і Тройдзеня, Альгерда, Вітаўта, Ягайлы. Уключэнне ў склад летапісаў асобных літаратурных помнікаў («Пахвала Вітаўту», «Пахвала гетману Астрожскаму», «Аповесць пра Падолле», «Аповесць пра Жыгімонта і Барбару Радзівіл» і інш.). «Сказанне пра віленскіх пакутнікаў Іаана, Антонія, Яўстафія».

## Літаратура XVI — першай паловы XVII стагоддзя
(4 гадзіны)

***Рэнесанс.*** Яго спецыфіка ў Беларусі. Сінтэз культурных плыняў: усходняй, грэка-візантыйскай, заходняй, рымска-каталіцкай.

***Рэфармацыя.*** Першыя лютэранскія пісьменнікі і прапаведнікі на Беларусі — Аўрам Кульва, Марцін Маньвід, Станіслаў Ранагелан, Сымон Зан і Мікалай Радзівіл Чорны. «Старазаконнікі». Творы М. Чаховіча, ананімнае «Асобнае мавенне» і інш. Заблудаўскі літаратурны гурток. Выданне зборніка павучанняў пад агульнай назвай «Евангелле вучыцельнае» (1569) і «Псалтыра з Часаслоўцам» (1570). Прадмовы Р. А. Хадкевіча ў сааўтарстве з І. Фёдаравым і П. Мсціслаўцам. Заснаванне П. Мсціслаўцам уласнай друкарні ў Вільні, выданне Евангелля (1575), Псалтыра (1576) і Часоўніка (1574—1576). В. М. Галабурда як прадаўжальнік традыцый І. Фёдарава і П. Мсціслаўца, як аўтар прадмоў і пасляслоўяў да выдадзеных ім Евангелля (1580) і Актоіха (1582). Уздзеянне на літаратурны працэс Беларусі царкоўнай уніі 1596 г.

***Мікола Гусоўскі*** (каля 1480 — пасля 1533). Шлях ад паляўнічага да дыпламата і паэта-лацініста. Аналіз паэмы «Песня пра зубра». Зубр як сімвал роднага краю, сродак выяўлення характару народа. Паказ месца і ролі чалавека на зямлі і сярод людзей праз узаемаадносіны зуброў у статку, праз паядынак паляўнічага і зубра.

Сцвярджэнне гуманістычных прынцыпаў дабра і свабоды, трывалага грамадства і дружнай сям'і. Заклік зберагаць багацці свайго краю, яго красу, прыроду. Паказ занятку простых людзей. Вобразы ўладароў Вялікага Княства Літоўскага — Жыгімонта Старога і князя Вітаўта. Вітаўт як праваднік і абаронца справядлівых парадкаў у дзяржаве. Яго воінская мудрасць, здатнасць прадухіліць небяспеку. Жанравая спецыфіка твора. Адзнакі эпапейнай грунтоўнасці, энцыклапедызму. Лірычныя адступленні. Пейзажныя замалёўкі. Выкарыстанне фальклорных форм мыслення. Пераклады «Песні...» на беларускую мову. Ацэнка творчасці Гусоўскага ў беларускім літаратуразнаўстве.

***Францыск Скарына*** (каля 1490 — каля 1551). Старонкі жыцця і дзейнасці. Пераклад і выпуск кніг Бібліі ў Празе і Вільні. Няўдалая спроба разгарнуць кнігадрук у Маскве. Сацыяльна-філасофскія погляды. Сутнасць «маральнага імператыву»: «научившись мудрости, добрее жить на свете». Роздум над праблемай разумнай суладнасці сіл грамадства, тыпова рэнесанснае ўяўленне пра ўладкаванне манархіі мудрымі законамі. Біблейскія кнігі як універсальны кодэкс, дзе змешчаны «все законы и права». Усведамленне нацыянальнай спецыфікі законаў, прызнанне права кожнага народа мець свае законы. Пошукі маральна-філасофскіх прынцыпаў заканадаўства, якія засцераглі б радзіму ад анархізму шляхты і дэспатызму караля. Ухваленне патрыятычнай ахвярнасці («Руф», «Эсфір», «Юдзіф»). Духоўная сувязь з радзімай як прыроджаная якасць усіх жывых істот. Ідэя славянскага і агульнаеўрапейскага яднання народаў на прынцыпах узаемнай павагі, мара пра «роўную свабоду ўсім». Палымяны заклік шанаваць родную мову, з якой «міласцівы Бог на свет пусціў». Скарына як паэт і заснавальнік свецкай паэзіі.

Скарыніяна. Праблемы, перспектывы. Вобраз Скарыны ў беларускім мастацтве і літаратуры. Значэнне дзейнасці Скарыны.

***Сымон Будны*** (1530—1593). Загадка паходжання. Літаратурна-грамадская дзейнасць. Выданне ў Нясвіжы «Катэхізіса...» (1562). «Апраўданне грэшнага чалавека перад Богам» як спроба шырокага абгрунтавання ідэй Рэфармацыі.

Выданне Апокрыфаў (1570). Перыяд у жыцці С. Буднага ў Лоску. Апошнія гады жыцця (супрацоўніцтва з Я. Л. Намыслоўскім, дыспут з езуітамі ў Полацку, жыццё ў Вішневе). Пытанні і прагалы ў біяграфіі С. Буднага. Спецыфіка хрысталагічнага вучэння С. Буднага. Успрынянцце боскіх запаведзяў як вышэйшага



маральнага закону. Заклік вырашаць грамадскія канфлікты на падставе законаў. Абгрунтаванне неабходнасці дзяржавы і свецкай улады. Сувязь рэфармацыйных ідэй С. Буднага з заходнееўрапейскай Рэфармацыяй, яго роля ў развіцці літаратуры і культуры Беларусі.

***Васіль Цяпінскі*** (каля 1540 — каля 1604). Звесткі пра жыццё і дзейнасць. Рэлігійна-філасофскія пошукі. Пераход на пазіцыі сацыніянства. Палеміка з прадстаўнікамі крайніх утапічных плыняў у палітыцы і сацыялогіі (з М. Чаховічам і інш.). Заснаванне ўласнай друкарні, выданне (каля 1580 г.) «Новага запавету, або Тэстаменту...». Крэда пісьменніка-гуманіста.

***Літаратура перыяду Контррэфармацыі.*** Гістарычныя ўмовы. Берасцейская унія (1596). Віцебскае паўстанне 1623 г. Праваслаўныя царкоўныя брацтвы. Развіццё літаратуры. Парадыйна-сатырычныя творы («Прамова Мялешкі», «Ліст да Абуховіча» і інш.). Царкоўна-палемічная публіцыстыка, яе два этапы. Нясвіжскі гурток.

***Мялецій Сматрыцкі*** (1577—1633). Жыццёвы шлях. Сувязь з Беларуссю. Літаратурная творчасць. «Трэнас» (1610). Глыбокі патрыятызм, боль за пакуты Айчыны. Палымяная медытацыя ў жанравай форме плачу Маці (Праваслаўнай царквы), звернутага да няўдзячных дзяцей. Паэтыка і рытміка народных галашэнняў. Непаслядоўнасць і супярэчлівасць дзейнасці М. Сматрыцкага. Палеміка з І. Пацеем (1608), з уніятамі і пераход на бок уніятаў («Апалогія» і «Разважанні», 1628; «Пратэстацыя», 1628; «Паранэзіс» і «Экзатэзіс», 1629). Паэтычнае пераасэнсаванне А. Разанавым яго твораў.

***Афанасій Філіповіч*** (каля 1597 — 1648). Жыццёвы шлях. Палітычная і рэлігійная дзейнасць. Пераезды, пасады. Барацьба супраць уніі. Трагізм жыццёвага лёсу. «Дыярыуш» (1644). Жывы і непаўторны вобраз аўтара. Шматпланавасць твора. Каларытнасць. Ідэйная насычанасць. Паказ барацьбы беларускага і ўкраінскага народаў за свае нацыянальныя і рэлігійныя правы. Моўна-стылявыя асаблівасці твора.

***Развіццё сілабічнай паэзіі на беларускай мове.*** Працяг традыцый Ф. Скарыны. Укараненне ўзораў антычнага верша на лаціні. Пераход ад інтанацыйна-сказавага маўлення да сілабікі на беларускай мове (у А. Рымшы, К. Транквіліёна-Стаўравецкага і інш.). Уключэнне беларускіх пісьменнікаў праз латынь у агульнаеўрапейскі літаратурны кантэкст. Рост нацыянальнай самасвядо-

масці і культуры. Узмацненне лацінамоўных тэндэнцый і пазіцый пасля Брэсцкай уніі 1596 г.

***Андрэй Рымша*** (каля 1550 — пасля 1595). Скупасць біяграфічных звестак. Паэма «Дзесяцігадовая аповесць пра ваенныя справы Крыштофа Радзівіла...» (1585). Эмблематычныя вершы-панегірыкі на беларускай мове, прысвечаныя Я. Валовічу, Л. Сапегу, Ф. Тышкевічу, Ф. Скуміну. «Дэкатэрас». «Храналогія». Асаблівасці твораў.

***Сімяон Полацкі*** (1629—1680). Біяграфія. Творчая дзейнасць першай паловы 50-х гг. XVII ст. Асабістыя кантакты з прадстаўнікамі «полацкай школы» — з Ф. Утчыцкім, І. Іяўлевічам. «Стихи краесогласнии...» (1659), «Пролог преподобной матери Евфросинии». Філасофска-пазнавальныя творы. Алегорыі дыдактычна-філасофскага зместу.

Навучальна-асветніцкая дзейнасць, удзел у развіцці друку. Рыфматварэнне. Сілабічныя вершы на беларускай, польскай і ўкраінскай мовах. Элегіі, эпіграмы, казанні, сатыры, панегірыкі. Зборнікі пропаведзяў «Абед душэўны» (1675) і «Вячэра душэўная» (1676). «Буквар языка словенска», пераклад «Псалтыры рыфматворнай» (з дадаткам вершаванага «Месяцаслова»).

Месца С. Полацкага сярод дзеячаў славянскай культуры, вядучая роля ў рускім Адраджэнні. Ушанаванне яго памяці.

***Перакладная літаратура.*** Рэлігійная літаратура. Выкарыстанне ў перакладах малазразумелай масаваму чытачу стараславянскай мовы. З'яўленне асобных перакладаў на старабеларускай мове (біблейскіх кніг Старога Запавету, Псалтыра). «Сказанне пра Сівілу-прарочыцу» і «Кніга пра Таўдала-рыцара». Пераклад са стараславянскай мовы «Гісторыі жыцця Варлаама і Іасафа» (1637), «Жыцця Аляксея». Зборнік «Жыціі Святых», яго беларускі пераклад у праваслаўным асяроддзі. Пераклад прыродазнаўчых, астралагічных і філасофскіх зборнікаў («Загадкі цара Давіда», «Шасцікрыл», «Тайная тайных...» і інш.).

Свецкая літаратура. Пераклад гістарычных аповесцей і раманаў («Троя», «Александрыя», «Пра пабоішча Мамая», «Аповесць пра Баву», «Аповесць пра Трышчана» і інш.). Зборнікі навел (Супрасльскі зборнік, «Вялікае люстра», «Рымскія дзеі» і інш.). Хронікі і хранографы (Марціна Бельскага, Аляксандра Гваніні, Мацея Стрыйкоўскага і інш.). Хранаграфічная кампіляцыя, складзеная ў XVII ст., — «Летапіс, або Вялікая хроніка...». «Хроніка



літоўская і жамойцкая» ў яе складзе. Пераклады твораў сусветнай літаратуры на польскую мову ў ВКЛ.

Роля перакладаў у секулярызацыі старажытнай беларускай літаратуры, у яе абнаўленні і развіцці. Беларусь як пасрэдніца ў распаўсюджванні помнікаў сусветнай літаратуры.

## ЛІТАРАТУРА БЕЛАРУСІ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XVII — XVIII СТАГОДДЗЯ
(2 гадзіны)

Эканамічны і палітычны заняпад Рэчы Паспалітай. Беларусь як арэна антыфеадальнай вайны 1648—1651 гг., руска-польскай вайны 1654— 1667 гг. Паўночная вайна (1700—1721). Пратэкцыя Расіі над Рэччу Паспалітай (з 1717). Слуцкая і Торунская канфедэрацыі (1767). Пазіцыя Караля Радзівіла. Барская канфедэрацыя (1768). Тры падзелы Рэчы Паспалітай (1772, 1793, 1795). Спробы рэформ. Чатырохгадовы сойм (1788 — 1792). Канстытуцыя 3 мая 1791 г. Вайсковая, Скарбовая і Адукацыйная камісіі. Дзейнасць Г. Калантая і Г. Каніскага. Таргавіцкая канфедэрацыя (1792), падтрымка яе Расіяй. Паўстанне Т. Касцюшкі.

Становішча Беларусі ў Рэчы Паспалітай. Паланізацыя і акаталічванне насельніцтва. Выцясненне беларускай мовы з дзяржаўнага справаводства, афіцыйнай перапіскі (пастанова сойма 1697 г.). Трыумф Контррэфармацыі, ордэна езуітаў. Супрацьборства літвінскіх і польскіх тэндэнцый. Дэмаграфічны крызіс. Уцёкі праваслаўных і ўніятаў у Маскоўскую Русь, імкненне злучыцца з ёю, праяўленне гэтага ў літаратуры. Рукапісны і ананімны характар літаратуры на беларускай мове, яе арганічнае спалучэнне з фальклорам. З'яўленне двухмоўных твораў (беларуска-польскіх, беларуска-ўкраінскіх). Шматмоўе. Царкоўна-манастырскія школы і калегіі як асноўныя цэнтры пісьменнасці.

Паэзія. Барочная, філасофская і інтымная лірыка. Прадстаўнікі высокага, сярэдняга і нізкага стыляў у паэзіі барока.

Узнікненне тэатра на Беларусі, яго віды. Драматургія.

Школьная драматургія. Батлеечныя творы («Цар Ірад», «Цар Максіміліян» і інш.). Велікодныя і масленічныя драмы. Інтэрмедыі «Цімон Гардзілюд» К. Пянткоўскага, «Чорт Асмалейка», пралог і эпілог да «Камедыі пра Якуба і Іосіфа» Я. Пылінскага, антыпралог і інтэрмедыйныя ўстаўкі пра казака, салдата і яўрэя да драмы «Духоўнае прычасце святых Барыса і Глеба» і інш.

***Каятан Марашэўскі*** (гады нараджэння і смерці невядомыя). Беларуска-польская «Камедыя» (1787). Праявы паэтыкі класіцызму, уплыў барочных інтэрмедый. Ідэі Асветніцтва. Спецыфіка гутарковай беларускай мовы ў творы. Выкарыстанне сюжэта «Камедыі» беларускімі драматургамі XX ст. (Ф. Аляхновічам, С. Кавалёвым і інш.). Трагедыя «Свабода ў няволі». Вобраз палкаводца Велізарыя, які ставіць інтарэсы Радзімы вышэй за асабістыя.

***Міхал Цяцерскі*** (?—1797). Звесткі з жыцця. Пераробка на польска-беларускі лад камедыі Ж.-Б. Мальера «Доктар па прымусу» (1787). Мясцовы каларыт твора, вобразы беларускіх сялян Апанаса і Хведара. «Сапар» (1788) і «Фемістокл» (1790). «Шлюб, пастаўлены дагары нагамі штучкамі Арлекіна» і «Камедыя» (1790—1791). «Апалон-заканадаўца, або Рэфармаваны Парнас» (1789). Тыпалагічныя ніці твора.

## ЛІТАРАТУРА БЕЛАРУСІ XIX СТАГОДДЗЯ
(4 гадзіны)

Агульная характарыстыка беларускай літаратуры XIX ст. Яе перыядызацыя. Падзел на два перыяды ў залежнасці ад грамадска-палітычнай сітуацыі.

### Літаратура першай паловы XIX стагоддзя
(1 гадзіна)

Фарміраванне беларускай нацыі. Паэзія на беларускай мове. Я. Чачот, Я. Баршчэўскі, П. Багрым, Ф. Савіч, І. Легатовіч, В. Дунін-Марцінкевіч, Г. Марцінкевіч, А. Рыпінскі, Адэля з Устроні. Іх біяграфіі. Сацыёлага-эстэтычны аналіз твораў. Першая кніжка на беларускай мове «Кароткі збор хрысціянскае навукі...» (1835). Ананімная паэзія. Яе сялянскі каларыт, фальклярызм. «Энеіда навыварат». Ідэйны змест паэмы. Разгляд розных версій аўтарства. Беларускае жыццё ў вершах «Уваскрэсенне Хрыстова», «Скажы, вяльможны пане...», «Вясна гола перапала», «Віншаванне бондара Савасцея», «Імяніннае віншаванне», «Вось які цяпер люд стаў».

Філаматы і філарэты. Іх праграма, статут, творчасць, роля ў беларускай літаратуры. Аналіз твораў А. Міцкевіча, Я. Чачота, Т. Зана, А. Э. Адынна, А. Петрашкевіча, А. Ходзькі, М. Рукевіча, І. Дамейкі і інш. Раман «Пан Падстоліч...» Э. Т. Масальскага. Аповесць «Яцак», «Паэзія» (т. 1—2, 1827—1828) Ю. Масальскага.



***Ян Чачот*** (1796—1847). Біяграфія. Фальклорныя «Песні з-пад Нёмана і Дзвіны».

***Адам Міцкевіч*** (1798—1855). Біяграфія. Творчы шлях. «Балады і рамансы» (1822). Сцвярджэнне рамантызму. Выкарыстанне беларускага фальклору (балады «Свіцязь», «Рыбка» і інш.). Прывабны вобраз рамантычнага героя — змагара за шчасце і свабоду Літвы — Беларусі («Ода да маладосці», «Песня філарэтаў», паэма «Мешка, князь Навагрудскі», апавяданне «Жывіла»). Сувязі з Расіяй і рускай паэзіяй. Пераклады балад «Ваявода», «Будрыс і яго сыны» А. С. Пушкіным. Паэмы «Гражына», «Конрад Валенрод», «Дзяды». Санеты. Паэзія перыяду эміграцыі. «Пан Тадэвуш» як нацыянальная эпапея, энцыклапедыя беларускага жыцця. Тыпалагічныя сувязі з «Новай зямлёй» Я. Коласа. Міцкевіч і Беларусь.

***Ян Баршчэўскі*** (1792 ці 1794—1851). Біяграфія. Вершы на беларускай мове: «Дзеванька», «Гарэліца», «Бунт хлопаў». Апрацоўка беларускіх легенд і паданняў (балады «Русалка-спакусніца», «Дзве бярозы». «Роспач», «Курганы», «Зарослае возера», «Дзявочая крыніца»). Рэгіянальны, полацкі, каларыт балад. Тэма роднага краю, паказ трагічных чалавечых лёсаў (паэма «Жыццё сіраты», аповесць «Драўляны дзядок і кабета Інсекта», «Душа не ў сваім целе»). «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях». Шляхта і мужыкі. Плачка, Сын Буры, Пакутны Дух як праваднікі нацыянальнай ідэі. Заклік берагчы і шанаваць Плачку-Беларусь.

### Літаратура другой паловы XIX стагоддзя
(3 гадзіны)

Духоўная атмасфера эпохі. Заканамернасці літаратурнага развіцця. Паэзія на беларускай мове. Агляд. Характарыстыка паэтаў і іх твораў (В. Дунін-Марцінкевіч, У. Сыракомля, В. Каратынскі, А. Вярыга-Дарэўскі, Ф. Багушэвіч, Я. Лучына).

***Літаратура напярэдадні і ў час паўстання 1863 г.*** Імкненне царызму «задобрыць» сялян. Ідэя «дрэннага пана» і «добрага цара» («Бяседа старога вольніка...», «Прамова Старавойта...» і інш.). Удзел у паўстанні беларускіх пісьменнікаў. Выказванні пра самастойнасць Літвы — Беларусі. Адкрыццё на Віленшчыне беларускіх школ. Выданне ў Варшаве беларускага лемантара (1862).

***Ананімная паэзія.*** Яе агульная характарыстыка, вядучая праблематыка. «Тарас на Парнасе». Версіі аўтарства. Сімволіка і ідэйны

змест. Дасканаласць верша, мовы. «Два д'яблы». Гісторыя выяўлення і вывучэння паэмы. Аналіз ананімных твораў перыяду рэформы 1861 г. і паўстання 1863 г.: «Гутарка двух суседаў», «Гутарка пана з селянінам», «Гутарка старога дзеда», «Крыўда і праўда», «Дзякуй Богу і гаспадару» і інш. Ананімныя вершы пазнейшага часу: «Дудар», «Праўда», «Тэатр», «Ноччу ў сяле», «Хто я?» і інш.

***Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч*** (1808—1884). Біяграфія. Выкарыстанне фальклору ў паэмах і вершаваных аповесцях 1850-х гг. («Гапон», «Травіца брат-сястрыца», «Шчароўскія дажынкі», «Купала», «Быліцы. Расказы Навума», «Вечарніцы» і інш.). Узоры народнай дасціпнасці (у Навума Прыгаворкі, Ананія, Ціта). Драматургія В. Дуніна-Марцінкевіча. «Ідылія». Ідэйны змест, вобразы, мастацкія сродкі. Прыём пераапранання. «Пінская шляхта». Шляхта і царскае чыноўніцтва ў паказе камедыёграфа, крытычны пафас. Майстэрства арганізацыі сюжэтнага дзеяння, моўнай характарыстыкі герояў. Гратэск, шарж у творы. Сцэнічнае жыццё п'есы. Змест, галоўныя вобразы, наватарства, мастацкія асаблівасці п'есы «Залёты». Выкрыццё маралі Сабковіча. Ідэалізацыя добрых паноў. Значэнне творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча.

***Уладзіслаў Сыракомля*** (1823—1862). Творчы шлях. Дэбют («Паштальён», 1844). Пераўтварэнне гэтай «гавэнды» ў папулярную рускую песню. Адлюстраванне паэтам духоўнага свету простых людзей («Улас», «Споведзь пана Корсака», «З уражанняў палескага падарожжа», «Непісьменны», «Гарбар» і інш.). Паказ імкнення сялян вырвацца на волю, выяўленне стыхійнага бунту іх душы («Гуляй, душа», «Нядзеля»), пратэсту («Сахар-мароз», «Мазурка»), абурэння жорсткасцю і абыякавасцю паноў («Эпітафія землеўласніку», «Лялька», «Ілюмінацыя», «Дзяўчына»). Ілюзіі класавага салідарызму («Добрыя весці», «Вясковыя палітыкі», «Лісты з Беларусі»). Цытаванне фальклору, запазычванне сюжэтаў і матываў («Пра зачараваны скарб», «Хадыка»), пераклады і апрацоўкі народных песень («Народная песенька з ваколіц Вільні», «Жніўная песня», «Доля», «Груган»). Вершы на беларускай мове: «Добрыя весці», «Ужо птушкі пяюць усюды». Сацыяльны змест, мастацкія вартасці.

***Францішак Багушэвіч*** (1840—1900). Лёс. Асоба. Творчы воблік. Ідэалогія нацыянальнага адраджэння, абвостраная сацыяльнасць. Мацей Бурачок і Сымон Рэўка з-пад Барысава як уяўныя аўтары кніг Ф. Багушэвіча. Вершаваны зборнік «Дудка беларуская» (1891). Дзве іпастасі Бурачка — мужык і дудар, сялянскі паэт і



інтэлектуал. Мужнасць. Вернасць сваёй рэлігіі, роднаму куту, «тутэйшасць» («Хрэсьбіны Мацюка», «Мая хата» і інш.). Усведамленне сацыяльнай няроўнасці («Бог не роўна дзеле...», «Дурны мужык, як варона» і інш.). Вобраз Аліндаркі («Кепска будзе!»). Апакрыфічныя матывы, міфалагізм («Хцівец і скарб на святога Яна», «Быў у чысцы»). «Смык беларускі» (1894). Лірызм твораў Сымона Рэўкі з-пад Барысава («Песні»), перавага лірыкі над эпікай (у параўнанні з Мацеем Бурачком). Паказ мужыцкага гора і галечы («Гора», «Чаго бяжыш, мужычок?»), пякучай нянавісці мужыкоў да пана-драпежніка і паразіта («Панская ласка», «Скацінная апека»). Маральны кодэкс аўтара («Ахвяра»).

Проза. Яе ідэйна-мастацкі змест, праблематыка, характары (Бартак Сасок, Тралялёначка, дзядзіна, сведка, палясоўшчык, апавядальнік, вяскоўцы). Роля Ф. Багушэвіча ў нацыянальна-вызваленчым руху, у літаратуры. Вывучэнне яго спадчыны.

***Янка Лучына*** (1851—1897). Жыццё і творчасць па логіцы пазітывізму. Цыкл нарысаў «З крывавых дзён» (пра паўстанне 1863 г.). Зборнікі вершаў: на польскай мове — «Паэзія» (1898), на беларускай — «Вязанка» (1903). «Паляўнічыя акварэлькі з Палесся». Вобраз паляўнічага Грышкі. Даследаванне творчасці пісьменніка ў літаратуразнаўстве.

***Вінцэсь Каратынскі*** (1831—1891). Біяграфія. Вершы на беларускай мове: «Уставайма, братцы, за дзела, за дзела», «Далібог-то, Арцім...», «Туга на чужой старане». Паэма «Таміла».

Трагічная наканаванасць лёсу працаўніка.

## ЛІТАРАТУРА БЕЛАРУСІ XX — ПАЧАТКУ XXI СТАГОДДЗЯ
(16 гадзін)

### Літаратура пачатку XX стагоддзя
(5 гадзін)

Гістарычныя ўмовы развіцця літаратуры пачатку XX ст. Рэвалюцыя 1905—1907 гг. і нацыянальнае адраджэнне. Асабісты ўдзел пісьменнікаў (Цёткі, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, А. Гаруна, В. Ластоўскага, М. Гарэцкага, З. Бядулі, Ядвігіна Ш. і інш.) у грамадска-культурным руху пачатку XX ст. Газеты «Наша доля» і «Наша ніва», кансалідацыя творчых сіл на платформе «нашаніўства». З'яўленне іншых перыядычных выданняў. Разгортванне

кнігавыдавецкай дзейнасці. Культурна-асветніцкая праца Б. Эпімах-Шыпілы. Арганізацыя бібліятэк, гурткоў мастацкай самадзейнасці, тэатральных калектываў (І. Буйніцкі, Ф. Ждановіч, У. Галубок і інш.). Культурна-асветніцкая і літаратурная плыні ў нашанiўскім руху. Славянскі друк пачатку XX ст. пра беларускае нацыянальнае адраджэнне, літаратуру, дзейнасць «Нашай нівы».

Пачатак Першай сусветнай вайны і адносіны да яе беларускіх пісьменнікаў (З. Бядулі, А. Гаруна, Я. Купалы, М. Гарэцкага і інш.). Сацыяльна-палітычныя абставіны на Беларусі ў 1917—1920 гг. Грамадзянская і творчая далучанасць да падзей дзеячаў беларускай культуры. З'яўленне новых газет на беларускай мове («Дзянніца», «Беларускі шлях», «Звон», «Беларусь», «Беларускае жыццё», «Рунь» і інш.). Ідэйная пазіцыя выданняў. Нацыянальна-патрыятычная скіраванасць тагачаснай паэзіі і публіцыстыкі.

***Цётка*** (Алаіза Пашкевіч, 1876—1916). Біяграфічныя звесткі. Шматгранная культурна-грамадская і творчая дзейнасць. Цэласнасць натуры, чалавечая самаахвярнасць. Ідэйна-эстэтычныя вытокі творчасці. Раннія вершы («Лета», «Восень», «Нямаш, але будзе» і інш.). Паэтызацыя прыроды, выхад на сацыяльныя праблемы. Выкарыстанне вопыту фальклору. Зборнікі паэзіі «Хрэст на свабоду» і «Скрыпка беларуская» (1906), гісторыя іх выдання. Рэвалюцыйна-вызваленчыя матывы ў вершах «Мора», «Хрэст на свабоду», «Пад штандарам» і інш. Цётка як пачынальніца беларускай палітычнай лірыкі. Цётка-празаік. Апавяданне «Прысяга над крывавымі разорамі» як роздум над сутнасцю рэвалюцыйных падзей. Зварот да агульначалавечай праблематыкі ў творах пазнейшага часу («Асеннія лісты», «Міхаська», «Зялёнка», «Лішняя»). Вобраз паэтэсы ў літаратуры і мастацтве.

***Янка Купала*** (Іван Луцэвіч, 1882—1942). Этапы жыццёвага шляху. Вытокі творчасці Я. Купалы. Пераемнасць традыцый папярэднікаў і іх узбагачэнне. Зборнік «Жалейка» (1908) як падсумаванне ранняга творчага вопыту. Характар мастакоўскага светабачання ў зборніку «Гусляр» (1910). Зборнік «Шляхам жыцця» (1913) і яго месца ў творчасці паэта.

Раннія паэмы Я. Купалы («Зімою», «Нікому», «Калека», «Адплата кахання», «У піліпаўку», «За што?»). Фальклорны каларыт твораў, іх сувязь з вершаванымі аповесцямі XIX ст. Драматычныя паэмы «Адвечная песня» (1908), «Сон на кургане» (1910), «На папасе» (1913). Наватарская сутнасць твораў, іх гісторыка-літаратурнае значэнне. Гістарычная абумоўленасць звароту мастака да драматургічных жанраў. Камедыя «Паўлінка» (1912) як вяршыннае дасягненне ранняй беларускай драматургіі. Сцэнічнае жыццё п'есы. Жарт-вадэвіль «Прымакі» (1913). Драма «Раскіданае гняздо» (1913). Адлюстраванне ў п'есе гісторыі Купалавага роду. Праблематыка, знешні і ўнутраны канфлікт твора. Трагікамедыя «Тутэйшыя» (1922) як завяршэнне драматургічнай дзейнасці Я. Купалы. Прычыны выкрэслівання твора з літаратурна-сцэнічнага ўжытку. Час і месца дзеяння ў п'есе. Трывога за лёс Бацькаўшчыны на пераломных этапах гісторыі. Акцэнт на трагедыі «тутэйшасці».

Водгук на сацыяльна-палітычныя падзеі і выяўленне духоўнага самаадчування паэта ў цыкле вершаў канца 1918 г. («Для Бацькаўшчыны», «Свайму народу», «На сход!», «Час!», «Спадчына», «Паязджане» і інш.). Роздум аб гістарычным лёсе Бацькаўшчыны ў пазнейшых творах («З павяўшай славы...», «Паўстань...», «Перад будучыняй», «Прыйдзе» і інш.).

Выхад у свет зборніка «Спадчына» (1922). Глыбіня сацыяльна-філасофскага зместу кнігі. Мастацкае асэнсаванне гістарычнага шляху Беларусі, услаўленне яе дзяржаўнасці ў паэме «Безназоўнае» (1924). Сімволіка-метафарычныя вобразы і карціны ў творы (заручыны, вяселле, нявеста, госці і інш.). Выкарыстанне традыцый фальклору. Рытміка-інтанацыйны лад паэмы. Зборнік «Безназоўнае» (1925) як вынік купалаўскай творчасці 1919—1924 гг.

1930-я гг. у творчасці Я. Купалы. Парадна-святочныя, спрошчана стэрэатыпныя карціны жыцця ў паэме «Над ракой Арэсай» (1933), у вершах «На нашым полі», «Нашай Канстытуцыі», «Выпраўляла маці сына», «З'езду Саветаў» і інш. Ідэалізацыя як асноўны мастацкі прынцып у творчасці паэта. Паэма «Тарасова доля» (1939) як адно з паэтычных дасягненняў 30-х гг.

Лірыка і публіцыстыка Я. Купалы перыяду Вялікай Айчыннай вайны («Беларускім партызанам», «Паўстаў народ», «Зноў будзем шчасце мець і волю», «Грабежнік», «Кліч да беларускага народа», «Народ-мсцівец» і інш.). Пафас, стылявыя асаблівасці твораў. Гістарызм мыслення аўтара. Я. Купала — перакладчык.

Вобраз народнага паэта ў літаратуры і мастацтве.

***Якуб Колас*** (Канстанцін Міцкевіч, 1882—1956). Біяграфічныя звесткі. М. Лужанін пра чалавечы і мастакоўскі воблік народнага песняра ў кнізе «Колас расказвае пра сябе». Пісьмо-запавет Я. Коласа нашчадкам. Вытокі творчасці Я. Коласа. Роля традыцый

рускай літаратуры ў фарміраванні будучага мастака слова. Адметнасць коласаўскай мастацкай сістэмы. Агульнае і адрознае з Я. Купалам. Зборнік паэзіі «Песні жальбы» (1910).

Праблематыка, жанрава-стылявыя асаблівасці «малой прозы» Я. Коласа. Сацыяльна-псіхалагічныя апавяданні 1912—1914 гг. і філасофска-сацыяльныя навелы Я. Коласа як пачатак нараджэння філасофскай плыні ў беларускай літаратуры.

Лірыка Я. Коласа першых паслярэвалюцыйных гадоў. Мастацкае спасціжэнне грамадска-палітычных рэалій («Да працы!», «Покліч»). Эстэтычнае крэда паэта («Водгулле»). Напружаны роздум аб лёсе народа і Радзімы («Беларускаму люду», «На чужыне», «Крыж», «Цені-страх», «Звон шыбаў»).

Паэма «Новая зямля» (1923) як этапная з'ява ў творчасці Я. Коласа і ўсёй беларускай літаратуры. Твор Я. Коласа і сучаснасць. Паэма «Сымон-музыка» (1925). Тры аўтарскія рэдакцыі, канцэпцыя мастака і мастацтва ў творы. Гісторыя блуканняў і пакут Сымона як алегарычнае ўвасабленне шляхоў нацыянальнага мастацтва. Складанасць пабудовы твора, канцэптуальны змест уступу, сэнсавае напаўненне ўстаўных навел, лірычных адступленняў.

Трылогія «На ростанях», гісторыя напісання. Аповесці «У палескай глушы» (1922) і «У глыбі Палесся» (1927) як выяўленне ідэйна-эстэтычнага ўзроўню беларускай прозы 20-х гг. і сведчанне інтэнсіўнасці творчага росту Я. Коласа. Уплыў атмасферы часу на заключную частку трылогіі — «На ростанях» (1954).

Паэма «Рыбакова хата» (1940—1947). Ідэйны змест, вобразна-выяўленчае майстэрства аўтара, ліра-эпічны характар твора. Творчасць Я. Коласа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Публіцыстыка. Патрыятычная лірыка. Паэмы «Суд у лесе» (1948), «Адплата» (1944).

Мастацкая і навукова-крытычная літаратура пра пісьменніка.

***Максім Багдановіч*** (1891—1917). Нетрадыцыйнасць фігуры М. Багдановіча ў беларускай паэзіі. Свядомая ўстаноўка паэта на красу, на мастацкую аздобленасць верша.

Пачатак літаратурнай дзейнасці. Праграмнае значэнне ранніх твораў («Музыка», «Песняру», «З песняў беларускага мужыка», «Прыйдзе вясна» і інш.). Дыскусія 1913 г. і пазіцыя М. Багдановіча. Праблема красы ў яго эстэтыцы («Апокрыф», «Апавяданне аб іконніку і залатару», «Мадонна» і інш.). Зборнік «Вянок» (1913) як сведчанне значнага творчага патэнцыялу маладога паэта, шырыні яго роздумаў і мастацкіх пошукаў.



Пейзажная і інтымная лірыка М. Багдановіча. М. Багдановіч як пачынальнік філасофскай плыні ў беларускай паэзіі. Праблемы жыцця і смерці, сэнсу чалавечага існавання, прыгожага (красы) і пачварнага, духоўнага і бездухоўнага ў вершах «Жывеш не вечна, чалавек...», «С. Е. Палуяну», «Трыялет» («Калісь глядзеў на сонца я...»), «Рандо» («Узор прыгожы пекных зор...»), «Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы...» і інш.

Арыентацыя паэта на народную песню ў вершах «беларускага складу» («Лявоніха», «Цёмнай ноччу лучына дагарала...», «Як Базыль у паходзе канаў...» і інш.). Цыкл «На ціхім Дунаі» як выяўленне новай творчай канцэпцыі паэта. Балады «Максім і Магдалена», «Страцім-лебедзь». Праблема героя, творчае пераасэнсаванне фальклорных сюжэтаў у творах. Узмацненне грамадзянскага, патрыятычнага і гуманістычнага пафасу на заключным этапе жыцця і творчасці («Беларусь, твой народ дачакаецца...», «Ты не згаснеш, ясная заранaчка...», «Пагоня»).

М. Багдановіч і беларускае нацыянальнае адраджэнне. Уклад пісьменніка ў духоўную культуру беларускага народа. Вобраз паэта ў літаратуры, музыцы, выяўленчым мастацтве.

***Максім Гарэцкі*** (1893—1938). Рознабаковасць таленту. Гарэцкі — пісьменнік, даследчык літаратуры, мовазнаўца, фалькларыст, перакладчык, публіцыст, рэдактар-выдавец. Род Гарэцкіх.

Імклівы ўваход у літаратуру. Навізна тэматыкі і праблематыкі ранніх твораў (апавяданні «У лазні», «Роднае карэнне», «Што яно?», драма «Антон» і інш.). Зборнік прозы М. Гарэцкага «Рунь» (1914) у кантэксце нацыянальнага эпасу пачатку XX ст. Вобраз інтэлігента-адраджэнца ў апавяданнях і аповесцях. Драматычны пошук ім шляхоў да паразумення з народам, свайго месца ў жыцці («У чым яго крыўда?», «Меланхолія», «Дзве душы» і інш.). Прысутнасць знешняга і ўнутранага аўтабіяграфізму ў творах. Падзеі Першай сусветнай вайны ў творах М. Гарэцкага «На імперыялістычнай вайне», «Літоўскі хутарок», «Генерал», «Рускі», «Жартаўлівы Пісарэвіч», «Ціхая плынь» і інш. Гуманістычная пазіцыя аўтара, выключная сумленнасць і праўдзівасць у паказе чалавека і абставін.

Народ, беларуская гісторыя ў творах М. Гарэцкага (апавяданні «Войт», «Лірныя спевы», «Панская сучка», «Зіма», аповесць «Ціхая плынь», раманы «Віленскія камунары», «Камароўская хроніка»). Народныя тыпы і характары, створаныя пісьменнікам (дзед Яўхім, Хомка, Мацей Мышка і інш.).

Месца і роля М. Гарэцкага ў нацыянальным прыгожым пісьменстве.

***Уладзіслаў Галубок*** (Уладзіслаў Голуб, 1882—1937). Шматграннасць творчай асобы У. Галубка. Стварэнне «вандроўнага тэатра», БДТ-3. Лёс тэатра і рэжысёра ў 30-я гг. Пачатак літаратурнай працы (зб. «Апавяданні», 1913). Паказ у празаічных творах сацыяльнай няроўнасці, гаротнага становішча сялян. Аналагічныя матывы ў паэзіі («Доля мужыка», «Забытая хатка», «Сярмяжнік» і інш.). Зварот да фальклору, пабудова сюжэта на камічнай гісторыі, вясковым жарце ці анекдоце (апавяданні «На кірмашы», «Журавінка», «Марымонавы сабакі», «Абмылка вучонага»). Алегарычныя творы «Навальніца», «Мінуўшчына».

Драматургія У. Галубка. Адлюстраванне ў ёй мінулага і тагачаснай сучаснасці («Ганка», «Пан Сурынта», «Суд», «Пісаравы імяніны», «Ветрагоны» і інш.). Увядзенне ў літаратуру розных жанравых форм (меладрама, гістарычная драма, камедыя). Напружанасць канфлікту, разнастайнасць характараў. Майстэрства стварэння камедыйных сітуацый, спалучэнне ў творах рэальнага і неверагоднага. Адкрытае ўключэнне аўтара ў развіццё дзеяння. Значэнне і роля ўласных прозвішчаў персанажаў (Ліпавічок, Абібок, Гарбуз і інш.). Шырокая прысутнасць фальклору ў п'есах (прыказкі, прымаўкі, песні і г. д.). Уклад У. Галубка ў развіццё беларускага тэатра і драматургіі.

***Змітрок Бядуля*** (Самуіл Плаўнік, 1886—1941). Біяграфічныя звесткі. Літаратурны дэбют З. Бядулі. Экспрэсіўнасць ранняй лірыкі і прозы пісьменніка. Рамантычнае светаадчуванне героя. Зборнік «Абразкі» (1913). Жанравая адметнасць твораў («Плач пралескаў», «Кветка», «Снілася мне казка...» і інш.). Зварот да рэалістычных сродкаў узнаўлення жыцця (зб. «На зачарованых гонях», 1923).

З. Бядуля — публіцыст, літаратурны і тэатральны крытык, дзіцячы пісьменнік.

***Алесь Гарун*** (Аляксандр Прушынскі, 1887—1920). Перыяды жыцця і творчасці пісьменніка. Пачатак літаратурнай дзейнасці. Творчыя арыентацыі. Ацэнка М. Багдановічам вершаў А. Гаруна. Гісторыя падрыхтоўкі да друку зборніка «Матчын дар» (1918). Думы аб Беларусі — лейтматыў паэзіі А. Гаруна. Вобраз выгнанніка-рэвалюцыянера і вобраз Радзімы ў творах. Прыродаапісальная і інтымная лірыка паэта («Мая люба», «Дзяўчаці», «Навакол», «У прыпар», «Восень», «Вясна», «Завіруха» і інш.). Філасофская



лірыка А. Гаруна: развагі пра сэнс жыцця, месца чалавека ў Сусвеце, яго прызначэнне («Як ліст вярбінкі маладой...», «Ідуць гады», «Навука», «Адбітак», «Думкі-дыяменты...» і інш.). Паэтычнае майстэрства А. Гаруна. Творчае засваенне і выкарыстанне фальклору: казак, легенд, жартаў («Канец Паўлючонка», «Шчасце Мацея», «Вяселле», «Габруська»).

Проза А. Гаруна (І. Жывіцы). Апавяданні «Першы снег», «Маладое», «Пан Шабуневіч», «Свята», «П'ера і Каламбіна» і інш. Іх героі, структура, ідэйна-мастацкі змест. Праблема нацыянальнага адраджэння ў творах. «Жывыя казкі» (1920), іх жанрава-стылявая своеасаблівасць. Месца і роля А. Гаруна ў беларускай літаратуры.

***Цішка Гартны*** (Зміцер Жылуновіч, 1887—1937). Грамадска-палітычная дзейнасць. Тэматычнае наватарства паэзіі Ц. Гартнага. Вобраз рабочага ў зборніку «Песні» (1913). Паказ народнага жыцця (вершы «Без працы», «Бяздольны», «Гарбар на вандроўцы», «Песні грабара» і інш.). Змена танальнасці ў кнігах савецкага часу («Песні працы і змагання», 1922; «Урачыстасць», 1925). Услаўленне заваёў рэвалюцыі, вольнай працы народа. Зварот да адкрыта публіцыстычных сродкаў пісьма. Тэматыка і праблематыка апавяданняў Ц. Гартнага, цесная сувязь твораў з сучаснасцю (зб. «Трэскі на хвалях», 1924; «Прысады», 1927; «Гаспадар», 1930).

Праца над раманам «Сокі цаліны» (1914—1929). Жанрава-тэматычнае наватарства твора. Вобраз прафесійнага рэвалюцыянера Рыгора Нязвычнага. Сюжэт і кампазіцыя рамана. Асаблівасці стылю. «Сокі цаліны» ў ацэнцы крытыкі 20-х гг. Сучаснае прачытанне твора.

Ц. Гартны — крытык і нарысіст (зб. «Узгоркі і нізіны», 1928; «Наступ на горны», 1932, і інш.). Вобраз З. Жылуновіча ў беларускай літаратуры.

## Літаратура 20—30-х гг. XX стагоддзя
(2 гадзіны)

Падзеі грамадска-палітычнага жыцця на Беларусі (усталяванне савецкай улады, падзел краіны на дзве часткі і г. д.). Пераадоленне наступстваў вайны і акупацый. Актывізацыя культурна-грамадскага жыцця. Адкрыццё БДУ, БДТ-1 і БДТ-2, Дзяржаўнай публічнай бібліятэкі і інш. Палітыка беларусізацыі, яе плённае ўздзеянне на агульны стан нацыянальнай культуры. Творчыя кантакты з прадстаўнікамі іншых літаратур. Пераезд у Савецкую Беларусь

нацыянальна свядомых пісьменнікаў і палітычных дзеячаў (М. Гарэцкага, В. Ластоўскага, А. Цвікевіча, Ф. Аляхновіча і інш.). З'яўленне літаратурна-грамадскіх часопісаў, альманахаў і г. д. Стварэнне літаратурных арганізацый («Маладняк», «Узвышша», «Полымя» і інш.) як вынік дэмакратычных тэндэнцый у жыцці грамадства. Ідэйна-эстэтычныя праграмы аб'яднанняў. Стаўленне сяброў арганізацый да класічнай спадчыны, вуснай народнай творчасці, іх погляды на месца і ролю літаратуры ў жыцці народа, выхаванні новага чалавека.

***Маладнякоўская паэзія і проза.*** Ідэя стварэння новага пралетарскага мастацтва. Пошукі арыгінальных вобразна-выяўленчых сродкаў (паэма М. Грамыкі «Гвалт над формай», вершы А. Александровіча, А. Вольнага, У. Дубоўкі, Т. Кляшторнага, А. Дудара і інш.). Жыццесцвярджальны пафас твораў, зварот да новага героя. Стварэнне першых у нацыянальнай прозе ўзораў прыгодніцкай літаратуры (аповесці М. Чарота «Свінапас», 1924; А. Вольнага «Два», 1925; А. Вольнага, А. Александровіча і А. Дудара «Ваўчаняты», 1925). Сюжэтна-кампазіцыйная блізкасць да «маладнякоўскай» аповесці твораў Я. Коласа («На прасторах жыцця», 1926) і З. Бядулі («Салавей», 1927). Схематызм, павярхоўнасць у адлюстраванні жыцця, аднапланавасць, штучнасць вобразаў у творах многіх маладых аўтараў, прычыны гэтага. Мастацкая практыка сяброў «Узвышша». Праблемна-тэматычная, жанрава-стылявая разнастайнасць літаратуры (паэмы У. Дубоўкі, Я. Пушчы, К. Крапівы, Т. Кляшторнага, М. Лужаніна, апавяданні і раманы К. Чорнага, А. Мрыя, вершы С. Дарожнага і г. д.). Паказ складанасці жыцця, роздум над лёсам чалавека і народа, клопат пра развіццё і чысціню роднай мовы. Арыентацыя на нацыянальна адметнае мастацтва. Нерэалізаванасць праграмы аб'яднання ў цэлым, прычыны гэтага. Уклад пісьменнікаў старэйшага пакалення (Я. Коласа, Я. Купалы, М. Гарэцкага, З. Бядулі і інш.) у літаратурны працэс. Адносіны былых «нашаніўцаў» і «маладнякоўцаў». З'яўленне нецярпімасці, варожасці ў пісьменніцкім асяроддзі. Перарастанне барацьбы літаратурнай у палітычную. Рэарганізацыя «Маладняка». Адмаўленне БелАПП ад нацыянальных традыцый. Прэтэнзіі кіраўніцтва Асацыяцыі на вядучую ролю ў літаратурным жыцці. Згортванне палітыкі беларусізацыі. Першыя арышты ў асяроддзі творчай інтэлігенцыі (Ф. Аляхновіч, А. Дудар).

***Язэп Пушча*** (Іосіф Плашчынскі, 1902—1964). Біяграфічныя звесткі. Жыццесцвярджальны пафас «маладнякоўскіх» зборнікаў



«Раніца рыкае» (1925), «Vita» (1926). Ідэйна-мастацкія адрозненні паміж «маладнякоўскім» і «ўзвышанскім» перыядамі ў творчасці паэта. Зборнікі Я. Пушчы 60-х гг. «Вершы і паэмы», «Пачатак легенды».

***Уладзімір Дубоўка*** (1900—1976). Адна з самых яркіх і арыгінальных постацей у маладой беларускай літаратуры 20-х гг. Складанасць і драматызм чалавечага лёсу. Раннія зборнікі «Строма» (1923), «Трысцё» (1925), «Credo» (1926). Схільнасць маладога аўтара да нетрадыцыйнай рытмікі, сімвалічнасці паэтычнага малюнка, асацыятыўнасці мыслення. Выявы «маладнякоўскай бурапеннасці»: ненатуральнасць асобных вобразаў, груваткасць параўнанняў, аднабаковасць адлюстравання жыцця. Паважлівае стаўленне Дубоўкі-маладнякоўца да класічнай спадчыны, жаданне вучыцца паэтычнаму майстэрству. Імкненне зрабіць жанрава разнастайнай беларускую паэзію. Тэма мастака і мастацтва ў паэтычнай трылогіі «Кругі» (1927), «І пурпуровых ветразей узвівы» (1929), «Штурмуйце будучыні аванпосты» (1929, 1965). Сюжэтнае і кампазіцыйнае наватарства паэм. Творы ва ўспрыманні крытыкі 20-х гг. і іх сучаснае прачытанне (М. Арочка, В. Максімовіч). Верш «За ўсе краі, за ўсе народы свету...» (1927) у лёсе У. Дубоўкі. Пераклічка твора з купалаўскай паэзіяй паслярэвалюцыйнага часу. Ураўнаважанасць, традыцыйнасць паэзіі У. Дубоўкі 50—70-х гг. Услаўленне ў творах ваеннага і мірнага подзвігу народа. Зварот да рэальных падзей і асоб, да жыццёвай канкрэтыкі («Сенненская Алеся», «Маленькая гераіня», «Ты, Ларыса, таксама Зарніца» і інш.). Любоў да роднай зямлі і захапленне суровай прыгажосцю Сібіры, Далёкага Усходу — прытулку ў час выгнання («Краса цудоўная ідзе», «Бачу вас зноў...», цыкл «Чакае ля берага човен мяне...» і інш.). Гісторыя напісання зборніка «Палеская рапсодыя» (1961). Вобраз Беларусі ў кнізе.

***Уладзімір Жылка*** (1900—1933). Біяграфічныя звесткі. «Дзённік» пісьменніка. Месца У. Жылкі ў літаратурным працэсе 20-х гг. Віленскі, пражскі перыяды ў творчасці пісьменніка. Стасункі з «Маладняком». Гістарычны лёс радзімы, незалежніцкія і адраджэнскія матывы ў творах паэта («Покліч», «Каваль», «Хто мужны, хто смелы, хто дужы...», «Беларусь» і інш.). Вера ў свой народ, у яго светлы заўтрашні дзень («Сёмуха», «Люблю, не знаючы пуціны...», «Толькі той, чый вольны дух...»). Вобраз рэвалюцыі ў паэзіі У. Жылкі («Віхор»). Традыцыі М. Багдановіча ў творчасці паэта: арыентацыя на класіку, зварот да кананічных

форм верша, культура паэтычнага радка, інтэлектуалізм і г. д. Багдановічаўскія вобразы і матывы ў вершах «Меч», «Палімпсест», «Хараство», «Вершы аб Вільні». Падобнасць лёсаў У. Жылкі і М. Багдановіча. Малюнкавасць, настраёвасць пейзажнай лірыкі («Летні вечар», «Вечарам», «Восень», «Вецер» і інш.). Прысутнасць у ёй асобы лірычнага героя. Роздум паэта над быційнымі праблемамі. Танальнасць філасофскай лірыкі. Настроі расчараванасці, смутку, тугі ў вершах («На ростані», «Бяспынна, глуха процьма часу...», «Усе мы страчаныя...» і інш.), прычыны гэтага. Мужны аптымізм паэта, пераадоленне страху смерці верай у бясконцасць жыцця і перамогу дабра. Споведзь і запавет наступным пакаленням — напісаная ў высылцы мініпаэма «Тэстамент». Светлы, узвышаны вобраз аўтара ў творы.

***30-я гг.*** Маласпрыяльныя ўмовы для творчасці, для сур'ёзнага асэнсавання жыцця народа. Падмена сапраўдных мастацкіх каштоўнасцей творамі-аднадзёнкамі, шырокае бытаванне ў літаратуры сацыяльных і ідэалагічных заказаў. Адыход ад рэалістычных традыцый узнаўлення падзей, ідэалізацыя і прыхарошванне як норма ў мастацкай творчасці. Пачатак масавых рэпрэсій супраць навуковай і творчай інтэлігенцыі і іх уплыў на духоўнае жыццё грамадства. Спроба самагубства Я. Купалы. Самароспуск «Узвышша». Пастанова ЦК ВКП(б) «Аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый». Стварэнне адзінага Саюза пісьменнікаў СССР. Станоўчае і адмоўнае значэнне гэтай падзеі. З'яўленне і афіцыйнае замацаванне ў тэорыі тэрміна «сацыялістычны рэалізм». Непрыманне фармальных пошукаў. Спрошчанае разуменне паняццяў класавасці, партыйнасці, народнасці літаратуры. Уплыў тэорыі факта, жывых уражанняў на беларускую літаратуру. Атаясамліванне сучаснасці твора з аператыўным водгукам на жыццёвыя факты. Прыярытэт у літаратуры індустрыяльнай тэматыкі. Спрошчанасць, схематызм канфліктаў у творах пра жыццё рабочага класа, збядненне духоўнага свету герояў (аповесці «Каландры» П. Броўкі, «Удар» Б. Мікуліча, драмы «Белая зброя» У. Галубка, «Напор» А. Александровіча, «Новы горад» І. Гурскага і інш.). Шырокі зварот беларускіх пісьменнікаў да жанру рамана (К. Чорны, М. Гарэцкі, М. Зарэцкі, П. Галавач, Р. Мурашка, М. Лынькоў, К. Крапіва, З. Бядуля, Б. Мікуліч, Ц. Гартны, Э. Самуйлёнак, С. Баранавых). Сцвярджэнне ў многіх творах надасабовых, дзяржаўных ідэалаў.



Адкрытае і схаванае непрыманне пісьменнікамі таталітарнай улады. Асуджэнне сумленнымі творцамі прымусовай калектывізацыі, паспешлівасці ў яе правядзенні (аповесці і раманы Я. Коласа «Адшчапенец», М. Зарэцкага «Вязьмо», Б. Мікуліча «Чорная Вірня», п'есы К. Чорнага «Лета», В. Шашалевіча «Рой»). Матывы расчараванасці і суму ў паэзіі У. Хадыкі, З. Астапенкі, С. Астрэйкі. Адстойванне ідэі даверу да людзей (камедыя К. Крапівы «Хто смяецца апошнім»).

***Андрэй Мрый*** (Андрэй Шашалевіч, 1893—1943). Біяграфія. Адметнасць таленту празаіка. Раннія допісы, нататкі, апавяданні. Нетрадыцыйнасць герояў, асаблівасці мовы твораў. Смелае адлюстраванне адмоўнага ў жыцці ў апавяданнях «узвышанскага» перыяду («Камандзір», «Няпросты чалавек», «Гармонія ў ружовым», «Рабін»). «Запіскі Самсона Самасуя» (1929) як першы сатырычны раман у нацыянальнай літаратуры. Гісторыя публікацыі. Прачытанне рамана ў 20-я гг. і ў наш час. Сацыяльнае паходжанне галоўнага героя, рысы яго характару, паводзіны і ўчынкі, адносіны да людзей (бацькоў, сяброў, калег па працы, начальства), да справы. «Непатапляльнасць» Самасуя, запатрабаванасць такіх кіраўнікоў і дзеячаў нованароджаным грамадствам. Шырокая тыповасць, універсальнасць адкрытага А. Мрыем вобраза. Сатырычныя вобразы другога плана (Сом, Лін, Крэйна, Мамон, Торба, Гарачы і г. д.), іх адрозненне ад Самсона Самасуя. Шапялёўка як мастацкая мадэль свету, створаная па законах сатырычнай літаратуры, як увасабленне безжыццёвасці, духоўнай аморфнасці адной з разнавіднасцей сучаснага пісьменніку мяшчанства — наменклатурна-чыноўніцкага. Адлюстраванне ў творы пачатковага этапу станаўлення культу асобы. Мажлівасць суаднясення рамана з жанрам антыўтопіі. Сродкі сатырычнага ўзнаўлення рэчаіснасці (мова персанажаў і аўтара, партрэтныя характарыстыкі, стварэнне камічных сітуацый, іронія, гратэск і г. д.). Жанрава-кампазіцыйныя асаблівасці рамана. Твор А. Мрыя ў кантэксце сатырычнай прозы 20—30-х гг. (аповесці, раманы, апавяданні М. Булгакава, М. Зошчанкі, А. Платонава, Я. Гашака, К. Крапівы і інш.).

***Кандрат Крапіва*** (Кандрат Атраховіч, 1896—1991). Жыццяпіс. Сімвалічны змест абранага псеўданіма. Аб'екты аўтарскага смеху ў ранніх зборніках «Асцё», «Крапіва» (абодва — 1925), «Апавяданні» (1926), «Людзі-суседзі» (1928). Крапіва-байкапісец. Праблематыка, героі баек, традыцыі народнай культуры смеха ў творах. Зварот пісьменніка да пародый і сатырычнай паэмы

(«Біблія», 1926; «Шкірута», 1928; «Хвядос — Чырвоны нос», 1930). Абумоўленасць ідэйнага зместу твораў грамадска-сацыяльнымі падзеямі таго часу. Разуменне К. Крапівой неабходнасці сатыры ў жыцці і літаратуры. Абарона сатырычных жанраў, іх тэарэтычнае асэнсаванне ў артыкулах «Думкі пра сатыру» (1928), «Што мне рупіць» (1933), «Аб сатырычнай камедыі» (1953), «Канфлікт — аснова п'есы» (1954). Паказ жыцця сялянства напярэдадні калектывізацыі ў рамане «Мядзведзічы» (першая кніга — 1932). Складанасць і супярэчлівасць вясковага свету, «заземленасць», бытавы характар раманных калізій. Прычыны нязакончанасці твора. Невыпадковасць звароту пісьменніка да драматургіі. Поспех першых п'ес «Канец дружбы» (1933), «Партызаны» (1937). Месца сатырычнай камедыі «Хто смяецца апошнім» (1939) у творчай спадчыне К. Крапівы. Гуманістычная ідэя твора, сутнасць канфлікту, вобразы персанажаў. Майстэрства драматурга. Тэма Вялікай Айчыннай вайны і яе мастацкае вырашэнне ў драмах «Проба агнём» (1943), «Валодзеў гальштук» (1943), «З народам» (1948), «Людзі і д'яблы» (1958). Нетрадыцыйны паказ ваеннай рэчаіснасці ў сатырычнай камедыі «Мілы чалавек» (1945). Праўдзівасць і жыццёвасць вобраза Жлукты. Наватарства формы, багацце і разнастайнасць камедыйных прыёмаў. Сцэнічны лёс п'есы. Уплыў тэорыі бесканфліктнасці на лірычную камедыю «Пяюць жаваранкі» (1950). Згладжанасць жыццёвых супярэчнасцей, ідылічнасць зместу. Новая мастацкая вышыня Крапівы-сатырыка — фантастычная камедыя «Брама неўміручасці» (1972). Філасофскі роздум пісьменніка над сэнсам і сутнасцю чалавечага існавання, развіццём цывілізацыі. Арганічны сплаў у творы фантастычнага і рэальнага. Галерэя сатырычных тыпаў і вобразаў, выведзеных аўтарам. Месца і роля станоўчых персанажаў у камедыі. Псіхалагічная драма «На вастрыі» (1982). Апошнія інтэрв'ю і выступленні народнага пісьменніка.

***Міхась Чарот*** (Міхась Кудзелька, 1896—1937). Прызнаны лідэр маладой паслякастрычніцкай літаратуры. Перайманне ў ранніх спробах пяра тэм і вобразаў Купалавай лірыкі («Звон», «Песня беларуса», «Беларусы», «Каб я быў...» і інш.). Выцясненне нацыянальна-патрыятычных матываў рэвалюцыйнай патэтыкай. Вобраз рэвалюцыі ў першым зборніку вершаў «Завіруха» (1922). Рамантычная акрылёнасць, узнёсласць як вызначальныя рысы паэзіі М. Чарота. Праблемна-тэматычная блізкасць вершаў да паэм «Босыя на вогнішчы» (1921), «Чырвонакрылы вяшчун» (1922),



«Ленін» (1924), «Беларусь лапцюжная» (1924), «Карчма» (1925). Адмаўленне старога свету і ўслаўленне новага ў творах. Апраўданне паэтам ахвяр і разбурэнняў («крыві і пажараў»), што нясе з сабой «Вялікая Будучыня». Пошук М. Чаротам новых прыёмаў і сродкаў мастацкай выразнасці. Месца паэмы «Босыя на вогнішчы» ў літаратурным працэсе 20-х гг. Сімволіка вобразаў, розныя трактоўкі «босых» (У. Ігнатоўскі, З. Жылуновіч, І. Багдановіч). Жанравая разнастайнасць прозы М. Чарота (імпрэсія, навела, апавяданне псіхалагічнае і гумарыстычнае, прыгодніцкая аповесць). Гуманістычны пафас твораў пра лёс прадстаўнікоў старога свету («Галя», «Талачка-шкрабалачка»). Удзел М. Чарота ў тэатральным гуртку «Беларуская хатка» і зварот да драматургіі. П'есы для дзяцей «Пастушкі», «Данілка і Аленка». Драма «На Купалле». Традыцыі В. Дуніна-Марцінкевіча і Я. Купалы ў камедыі-вадэвілі «Мікітаў лапаць».

***Міхась Лынькоў*** (1899—1975). Вобразы дзяцінства, звязаныя з чыгункай, у творах пісьменніка («У вагоне», «Чыгунныя песні», «Андрэй Лятун», «Міколка-паравоз»). Паказ у ранніх творах (апавяданні «Над Бугам», «Маньчжур», «Баян» і інш.) нараджэння новага чалавека, няпростага ўключэння людзей у змененую рэвалюцыяй рэчаіснасць. Цікавасць пісьменніка да праблемы гуманізму, яе мастацкае вырашэнне на матэрыяле Грамадзянскай вайны («Аб чалавечым сэрцы», «Салавей-разбойнік», «У мястэчку»). Вяртанне да праблемы ў апавяданні канца 30-х гг. «Сустрэчы».

Тэма Заходняй Беларусі ў творчасці празаіка. Адметнасць стылявой манеры М. Лынькова: арганічны сплаў рамантызму з лірызмам, прысутнасць у творы іранічнага падтэксту, псіхалагізм. Паказ барацьбы беларускага народа ў апавяданнях ваеннага часу (зб. «Астап», 1944). Скіраванасць аўтара на героіку вайны. Вобразы дзяцей у творах («Васількі», «Салют» і інш.). Праца над раманам «Векапомныя дні» (1949—1956). Спроба шырокага эпічнага асэнсавання подзвігу народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Адмаўленне аўтара ў другой рэдакцыі (1968) ад жанравага вызначэння раман-эпапея. Паказ у творы нараджэння і разгортвання партызанскай барацьбы. Абагульнены вобраз народа-змагара, народа-партызана. Шырокая падзейная аснова рамана, вялікая колькасць узноўленых чалавечых лёсаў, рэальныя прататыпы герояў. Месца рамана «Векапомныя дні» ў беларускай ваеннай прозе.

***Міхась Зарэцкі*** (Міхась Касянкоў, 1901—1937). Нарыс «Падарожжа на Новую Зямлю», няскончаны раман «Крывічы» ў

творчым і чалавечым лёсе М. Зарэцкага. Хуткае станаўленне творчай індывідуальнасці пісьменніка. Рысы «маладнякоўскай» прозы ў ранніх апавяданнях (зб. «У віры жыцця», «Пела вясна», абодва — 1925). Майстэрства псіхалагічнага аналізу Зарэцкага-апавядальніка. Навізна праблематыкі, сюжэтна-кампазіцыйнае майстэрства ў першых вялікіх эпічных творах («Голы звер», 1926; «Сцежкі-дарожкі», 1927). Меладраматычныя сітуацыі ў аповесці і рамане. Спалучэнне ў «Сцежках-дарожках» падзейнасці з глыбокім пранікненнем у псіхалогію герояў. Паказ драматычнага раздарожжа прадстаўнікоў інтэлігенцыі. Мастацкая нераўназначнасць першых і заключных частак рамана. Адлюстраванне М. Зарэцкім падзей калектывізацыі (нарысы «Вясна 1930», «Лісты ад знаёмага», раман «Вязьмо»). Грамадзянская пазіцыя пісьменніка ў ацэнцы лёсавызначальных для сялянства падзей. Раман «Вязьмо» (1932) у кантэксце літаратуры пра «вялікі пералом».

***Кузьма Чорны*** (Мікалай Раманоўскі, 1900—1944). Старонкі «Дзённіка» К. Чорнага пра жыццё ў Маскве і на радзіме. Вобраз пісьменніка ў мастацкай літаратуры. Уплыў Чорнага на творчасць беларускіх празаікаў.

Першыя публікацыі. «Маладнякоўская» паэтызацыя знешніх праяў жыцця ў ранніх творах («На граніцы», «Будзем жыць», «Быльнікавы межы», «Бяздонне»). Узмацненне псіхалагічнага аналізу («Буланы», «Пачуцці», «Хвоі гавораць» і інш.). Паказ звычайнага чалавека ў яго штодзённым жыцці як працяг традыцый папярэднікаў (Я. Коласа, З. Бядулі, М. Гарэцкага). Творчае крэда пісьменніка — «Чалавек — гэта цэлы свет». Раман і аповесць у творчасці К. Чорнага. Грандыёзная задума — стварыць цыкл эпічных твораў пра гістарычны шлях народа. Арыгінальнасць мастацкай ідэі цыкла. Цікавасць празаіка да філасофскіх праблем. Блізкасць першых раманаў «Сястра» (1927—1928), «Зямля» (1928) да апавяданняў. Ідэйны змест твораў. Раманы ў ацэнцы крытыкі (М. Гарэцкі, А. Адамовіч, І. Чыгрынаў). 30-я гг. як новы этап у творчасці К. Чорнага. Тэматыка, праблематыка, мастацкія асаблівасці, цэнтральныя вобразы раманаў «Бацькаўшчына» (1931), «Трэцяе пакаленне» (1935), аповесцей «Лявон Бушмар» (1929), «Люба Лук'янская» (1937). Сучаснае прачытанне «Трэцяга пакалення». Вяртанне ў гады вайны да ідэі складанасці чалавечага свету і немагчымасці яго поўнага вытлумачэння. Вяршынныя творы К. Чорнага — раманы «Млечны шлях», «Пошукі будучыні», «Вялікі дзень». Праблематыка, жанравыя асаблівасці раманаў.



Сімвалічныя і філасофскія вобразы, сцэны. Асэнсаванне беларускім аўтарам сутнасці і вытокаў фашызму. Месца твораў у літаратуры пра мінулую вайну. Асаблівасці стылю К. Чорнага.

## Літаратура Заходняй Беларусі
(1 гадзіна)

Падзеленасць літаратуры 20—30-х гг. на дзве часткі. Мінск і Вільня як культурныя цэнтры Беларусі. Перадумовы і прычыны гэтага: Першая сусветная вайна, акупацыя, заключэнне Рыжскага міру. Адрозненне шляхоў развіцця літаратур Усходняй і Заходняй Беларусі. Папулярнасць ідэі аб'яднання ў абедзвюх частках краіны.

Грамадска-палітычнае жыццё на «крэсах усходніх». Этапы нацыянальна-вызваленчага руху. Дзейнасць беларускага пасольскага клуба (БПК), Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады (БСРГ), Камуністычнай партыі і Камуністычнага саюза моладзі Заходняй Беларусі. Перыядычныя выданні на беларускай мове, іх вымушаная шматлікасць. Заснаванне Беларускай драматычнай майстроўні (Вільня, 1922). Культурна-асветніцкая праца гурткоў Таварыства беларускай школы (ТБШ). Тэатральнае мастацтва як адзін з дзейсных сродкаў прапаганды нацыянальнай ідэі. Актыўная праца ў драматургіі 20-х гг. Л. Родзевіча і Ф. Аляхновіча. Віленскі перыяд у творчасці М. Гарэцкага, У. Жылкі. Асэнсаванне лёсу Бацькаўшчыны, ідэі дзяржаўнасці беларускага народа ў публіцыстыцы (артыкулы Б. Тарашкевіча, А. Луцкевіча, А. Смоліча, М. Гарэцкага, Л. Родзевіча і інш.). Літаратурна-філасофскія эсэ І. Абдзіраловіча (І. Канчэўскага) «Адвечным шляхам» (1921), Сулімы (У. Самойлы) «Гэтым пераможаш!» (1923) як падсумаванне духоўнага вопыту нацыі, абгрунтаванне жыццяздольнасці беларускай нацыянальнай ідэі.

Спроба стварэння літаратурна-мастацкага аб'яднання «Веснаход» (1928). Неаднароднасць літаратурнага працэсу ў Заходняй Беларусі. Творчасць пісьменнікаў розных культурна-мастацкіх і ідэйных арыентацый, аб'яднаных ідэяй служэння Радзіме (Г. Леўчыка, З. Верас, К. Сваяка, Хв. Ільяшэвіча, А. Салагуба, М. Васілька, М. Машары, П. Пестрака і інш.). Працяг і развіццё ў 20-я гг. нашаніўскіх ідэй і традыцый. Пашырэнне масавай паэзіі, літаратуры факта. Вызваленча-рэвалюцыйная тэма ў паэзіі 30-х гг. (творчасць М. Танка, М. Машары, М. Засіма, В. Таўлая і інш.).

Вобраз палітвязня ў творах. Крытыка М. Танкам настрояў суму, тугі, запазычаных у папярэднікаў вобразаў, аднастайнасці формы вершаў. Спробы паэта выйсці за межы традыцыйнай рытмікі і вобразнай сістэмы. Месца Н. Арсенневай у літаратурным працэсе 20—30-х гг. Кнігі У. Калесніка пра літаратуру Заходняй Беларусі.

***Леапольд Родзевіч*** (1895—1938). Папулярнасць аднаактовых камедый Л. Родзевіча («Збянтэжаны Саўка», «Пасланец», «Конскі партрэт» і інш.) у гледачоў і рэжысёраў па абодва бакі мяжы. Асэнсаванне трагічных паваротаў гістарычнага лёсу народа ў драматычных сцэнах «Досвіткі» (1922). Сімвалічна-алегарычная драма «Пакрыўджаныя» (1922), выявы мадэрнізму ў творы. Светапоглядная эвалюцыя Л. Родзевіча. Пераход у сярэдзіне 20-х гг. у лагер камуністаў, падпольная дзейнасць у Заходняй Беларусі. Творчая пераарыентацыя пісьменніка. Выхад у Мінску зборнікаў паэзіі («На паняволеных гонях», 1928) і прозы («Рэвалюцыйным шляхам», 1928; «Вогнішча барацьбы», 1930).

***Валянцін Таўлай*** (1914—1947). Ранняе разуменне «забранасці» роднага краю. Падпольная дзейнасць В. Таўлая ў час знаходжання Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы і ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Сувязь першых спроб пяра (вершы «О ты, Згода, адгукніся...», «Ідзе за годам год», «Напрадвесні», «Жаўрук», паэма «Непераможная») з грамадска-палітычнымі падзеямі канца 20-х гг. Спалучэнне ў творах рэвалюцыйнага пафасу з лірызмам. Спецыфічнасць умоў нараджэння значнай часткі Таўлаевай спадчыны («Лукішскія вершы», «Мінуў астрожны дзень», «Бацьку», «Лісты з турмы» і інш., паэмы «Песня пра сухар», «Таварыш»). Высокі ўзровень прафесійнага майстэрства аўтара. Сімвалічная напоўненасць вобразаў.

## Літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага часу

(1 гадзіна)

Грамадска-палітычная сітуацыя напярэдадні Другой сусветнай вайны. З'яўленне тэмы будучай вайны ў літаратуры і мастацтве (песні, кнігі, кінафільмы). Творы на гэту тэму ў беларускай літаратуры (вершы П. Панчанкі «Першыя кулі», «Заўтра», «Параненны» і інш.; паэма А. Куляшова «Хлопцы апошняй вайны»). Ваенныя дарогі беларускіх пісьменнікаў. Абарваныя вайной жыцці (М. Сурначоў, Л. Гаўрылаў, А. Коршак, З. Астапенка і інш.).



Паэтычны зварот Я. Купалы да беларускага народа («Беларускім партызанам»). Перавага лірыкі над іншымі родамі літаратуры. Шырокае бытаванне балады, вершаў баладнага тыпу («Ліст з палону» А. Куляшова, «Няўзяты форт», «Уральскі танк» А. Вялюгіна, «Рана» П. Броўкі, «Герой» П. Панчанкі і інш.). Вобраз Беларусі-змагаркі і Беларусі-паланянкі. Паяднанасць лёсу радзімы і лёсу аўтараў. Абвостранае пачуццё гістарызму, пошукі духоўнай падтрымкі ў мінулым народа («Курганы» П. Панчанкі, «Кастусь Каліноўскі» П. Броўкі, «У стоптаным жыце» М. Сурначова і інш.). Зварот да першаасноў народнага жыцця, традыцый і звычаяў беларусаў, да вуснай народнай творчасці («Родная мова» М. Танка, «Будзем сеяць, беларусы!» П. Броўкі, «Родны хлеб» П. Глебкі, «Над брацкай магілай» А. Куляшова і інш.). Ліра-эпас ваенных гадоў. Паэмы Я. Коласа «Адплата», «Суд у лесе», А. Куляшова «Сцяг брыгады», «Прыгоды цымбал», П. Броўкі «Паэма пра Смалячкова», «Беларусь», М. Танка «Янук Сяліба», А. Бялевіча «Мой майстра», З. Астапенкі «Эдэм». Абумоўленасць тэматыкі, ідэйнага зместу твораў суровым подыхам часу.

Гісторыя выдання паэтычнага зборніка А. Астрэйкі «Слуцкі пояс» (1943). Паказ партызанскага жыцця, гераізму будняў («Ты знаеш, што такое восень...», «У зямлянцы», «Утаплю я гора...», «Мой шацёр» і інш.).

Эпічныя і драматургічныя творы. Паказ гераізму і патрыятызму савецкага чалавека («Маленькая жанчына», «Вялікае сэрца» К. Чорнага; «Ірына», «Астап», «Салют» М. Лынькова). Сувязь апавяданняў з рэальнымі жыццёвымі фактамі і падзеямі. Першыя празаічныя творы І. Мележа, І. Шамякіна. Своеасаблівасць узнаўлення вайны ў раманах і аповесцях К. Чорнага («Млечны шлях», «Пошукі будучыні» і інш.). Шырокае абагульненне падзей, вырашэнне пісьменнікам філасофскіх праблем. Дзейнасць БДТ-1 і БДТ-2 у гады Вялікай Айчыннай вайны. Драма К. Крапівы «Проба агнём». Маральна-этычны канфлікт у творы.

***Літаратура пасляваеннага перыяду.*** Тэматычная разнастайнасць беларускай паэзіі. Паступовы адыход ад ваеннай тэматыкі і пераключэнне на праблемы мірнага часу. Паслабленне сувязей паэзіі з жыццём. Ідэалізацыя рэчаіснасці, схематызм, ілюстрацыйнасць, адрыў лірычнага «я» ад асобы аўтара як уступкі тэорыі бесканфліктнасці. Эпізацыя лірыкі. Праблемы мінулай вайны і адбудовы мірнага жыцця ў ліра-эпасе (паэмы П. Броўкі «Хлеб», 1946, А. Куляшова «Новае рэчышча», 1948, «Толькі ўперад», 1950,

«Грозная пушча», 1953—1956, А. Бялевіча «Сям'я», 1948, і інш.). Асэнсаванне духоўнага вопыту свайго пакалення. Неглыбокі паказ пасляваеннай рэчаіснасці. Адраджэнне і развіццё прозы, яе шматтэмнасць і шматжанравасць. Праца ў літаратуры пісьменнікаў старэйшага пакалення, амаль цалкам вынішчанага сталінскімі рэпрэсіямі 30—40-х гг. і вайной (Я. Колас, М. Лынькоў). Адлюстраванне гераічнага змагання беларускага народа ў гады вайны ў аповесцях і раманах І. Гурскага «Лясныя салдаты» (1945), У. Краўчанкі «Рыгор Шыбай» (1947), І. Шамякіна «Глыбокая плынь» (1948), А. Кулакоўскага «Расстаёмся ненадоўга» (1954), І. Мележа «Мінскі напрамак» (1952). Імкненне пісьменнікаў да шырокага ахопу падзей, да стварэння маштабных, панарамных эпічных палотнаў. Асваенне тэмы стваральнай працы А. Стаховічам, У. Краўчанкам, М. Паслядовічам, Т. Хадкевічам, А. Кулакоўскім (раманы і аповесці «Пад мірным небам», «Станаўленне», «Цёплае дыханне», «Гартаванне» і інш.). Спрошчанасць жыццёвых канфліктаў, унутранага свету ў творах названых аўтараў. Першыя творы пра мірнае жыццё І. Мележа («Гарачы жнівень», 1947), І. Шамякіна («У добры час», 1952), Я. Брыля («У Забалоцці днее», 1951; «На Быстранцы», 1955).

Набыткі і страты пасляваеннай драматургіі, прысвечанай змаганню савецкага народа з фашыстамі. П'есы К. Крапівы «З народам» (1948), А. Маўзона «Канстанцін Заслонаў» (1947), К. Губарэвіча «Брэсцкая крэпасць» (1952). Сцэнічны лёс камедыі К. Крапівы «Пяюць жаваранкі» (1950).

Спробы пісьменнікаў выйсці з кола зададзенасці, прыхарошвання, спрашчэння рэчаіснасці. Вершы П. Панчанкі «Слова да паэтаў» (1948), «Пісьмо юнака да паэта» (1953), паэма М. Танка «Люцыян Таполя» (1946), аповесць Я. Брыля «На Быстранцы», камедыя А. Макаёнка «Выбачайце, калі ласка» (1953).

## Літаратура 60—80-х гг. XX стагоддзя
(5 гадзін)

Пашырэнне ідэйна-тэматычных абсягаў беларускай прозы. Адкрыццё новых характараў, зварот да складаных праблем мінулага і сучаснасці ў творах І. Мележа, В. Адамчыка, А. Адамовіча, М. Стральцова, І. Чыгрынава, В. Казько, В. Карамазава, А. Кудраўца, А. Жука. Працяг традыцый У. Караткевіча, актыўнае асэнсаванне далёкай гісторыі беларускага народа (творы У. Арлова,



Л. Дайнекі, В. Іпатавай, К. Тарасава). Лірыка А. Куляшова, М. Стральцова, У. Караткевіча («Быў. Ёсць. Буду», 1986), А. Разанава, А. Вярцінскага як сведчанне філасофскай, інтэлектуальнай «напоўненасці» беларускай паэзіі. Шматграннасць, складанасць духоўнага свету жанчыны ў вершах Д. Бічэль-Загнетавай, Е. Лось, Н. Мацяш, Я. Янішчыц, Р. Баравіковай, В. Коўтун. Зварот да фальклору, да класічных жанраў, пошукі новых жанравых форм паэтамі (творы М. Танка, Р. Барадуліна, Н. Гілевіча, А. Разанава). Спасціжэнне духоўнага вопыту існавання чалавецтва, народа ў паэмах А. Куляшова («Цунамі», 1968); «Далёка да акіяна», 1971; «Варшаўскі шлях», 1972; «Хамуціус», 1975), В. Зуёнка («Маўчанне травы», 1980), М. Арочкі («Крэва», «Курганне», 1982), у кнізе Я. Сіпакова «Веча славянскіх балад» (1973, 1983), у рамане ў вершах Н. Гілевіча «Родныя дзеці» (1985). Пошукі драматургіяй новых тэм, канфліктаў, зварот да надзённых праблем сучаснасці і да гісторыі (творы К. Крапівы, А. Макаёнка, М. Матукоўскага, А. Петрашкевіча, І. Шамякіна, І. Чыгрынава). Традыцыйнае і наватарскае ў п'есах 60—80-х гг. Лёс драматургічнай спадчыны У. Караткевіча. Прарыў да агульначалавечага, вечнага («Брама неўміручасці», 1972, К. Крапівы; «Святая прастата», 1974, «Дыхайце эканомна», 1982, А. Макаёнка; «Напісанае застаецца», 1978, А. Петрашкевіча) і выявы спрошчанага, класавага падыходу да жыццёвых з'яў («Лявоніха на арбіце», 1961, А. Макаёнка; «Русь Кіеўская», 1983, А. Петрашкевіча) у драматургіі. Прыход маладых талентаў (А. Дударава, У. Бутрамеева, А. Паповай). Асэнсаванне беларускім літаратуразнаўствам шляхоў станаўлення мастацтва слова, тэарэтычных аспектаў у літаратуры (кнігі М. Арочкі, С. Андраюка, А. Адамовіча, В. Бечыка, П. Дзюбайлы, В. Жураўлёва, В. Каваленкі, У. Конана, М. Мушынскага і інш.).

***Іван Навуменка*** (1925—2006). Паказ лёсу свайго пакалення — скразная тэма творчасці пісьменніка. Праблематыка ранніх зборнікаў прозы («Сямнаццатай вясной», 1957; «Хлопцы-равеснікі», 1958; «Верасы на выжарынах», 1960). Адметнасць асобы героя. Лірызм і рамантычная прыўзнятасць як вызначальныя рысы стылю. Аўтабіяграфічныя моманты ў раманах «Сасна пры дарозе» (1962), «Вецер у соснах» (1967), «Сорак трэці» (1973), «Смутак белых начэй» (1979). Праблемна-тэматычнае наватарства першага твора «партызанскай» трылогіі («Сасна пры дарозе»). Пераход ад рамана характараў да рамана падзей («Сорак трэці»).

***Пятрусь Броўка*** (1905—1980). Факты біяграфіі. Услаўленне рэвалюцыі і яе пераможнага шэсця ў першых зборніках вершаў «Гады як шторм», «Прамова фактамі» (абодва — 1930), «Цэхавыя будні» (1931). Тэндэнцыя да актыўнага самавыяўлення ў творах перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Глыбокая сыноўская ўзрушанасць лёсам роднай зямлі (вершы «Маці», «Роднае», «Байцам-беларусам», «Надзя-Надзейка», «Спатканне» і інш.; паэма-маналог «Беларусь», 1943). Вера ў светлае, вольнае заўтра радзімы. Балада ў творчасці П. Броўкі ваеннага часу. Зварот паэта да тэмы мірнай працы, адбудовы разбуранага вайной жыцця (паэмы «Ясны кут», 1944; «Хлеб», 1946). Паэтычны гладкапіс у творчасці П. Броўкі 60—70-х гг.

***Максім Танк*** (Яўген Скурко, 1912—1995). Жыццёвы шлях паэта. Пытанне пра пачатак творчага шляху. Патрыятычная і рэвалюцыйна-вызваленчая скіраванасць вершаў М. Танка 30-х гг. («Спатканне», «Песня кулікоў», «Павязлі цягнікі»). Лёс зборніка «На этапах» (1936). М. Танк і Н. Арсеннева. Спробы выйсці за межы традыцыйнай паэзіі. Жанравая разнастайнасць ліра-эпасу М. Танка 30-х гг.: «Нарач», «Журавінавы цвет», «Сказ пра Вяля» (усе — 1937); «Каліноўскі» (1938). Вобразы змагароў за народнае шчасце ў творах паэта (Грышка, Вяль, Кастусь Каліноўскі).

Няпростыя пошукі «свайго слова» пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны (вершы «Хмары з захаду», «Не шкадуйце, хлопцы, пораху», «Яшчэ нямала вёрст і дзён», «Родная мова», «Мы ў свой горад прыйшлі» і інш.; паэма «Янук Сяліба», 1943). Тэма малой радзімы, памяці пра мінулую вайну ў зборніках «След бліскавіцы» (1957), «Мой хлеб надзённы» (1962), «Глыток вады» (1964). Зварот да першааснoў народнага жыцця, паглыбленне гуманістычнага пафасу, ускладненне мастацка-вобразнай сістэмы твораў («Ave Maria», «Перапіска з Зямлёй», «Мой хлеб надзённы» і інш.).

М. Танк — майстра верлібра. Філасофская паглыбленасць творчасці. Арганічнае спалучэнне нацыянальнага і агульначалавечага, сучаснасці і мінулага, беларускага фальклору і культуры сусветнай цывілізацыі. Апошнія кнігі вершаў М. Танка.

***Аркадзь Куляшоў*** (1914—1978). Дзяцінства будучага паэта. Вучоба ў Мсціслаўскім педтэхнікуме. Знаёмства з Ю. Таўбіным і З. Астапенкам. Трагічны лёс сяброў А. Куляшова, адлюстраванне яго ў цыкле вершаў «Маналог» (1964—1965), у паэме «Далёка да акіяна» (1972).



Даніна «маладнякізму» і рытарычнасці ў першых зборніках «Росквіт зямлі» (1930), «Па песню, па сонца», «Медзі дождж» (абодва — 1932). Хуткае станенне маладога паэта. Зварот да ліра-эпасу. Пошукі новай паэмнай формы ў творах «Крыўда» (1931), «Аманат» (1933), «Гарбун» (1935). Адчуванні і памкненні савецкага чалавека ў нізках вершаў «Сонечнае заўтра» (1931), «Маім аднагодкам» (1932), «Юнацкі свет» (1939). Паэма-прадбачанне «Хлопцы апошняй вайны» (1940). Ваенныя старонкі біяграфіі пісьменніка. Гісторыя напісання паэмы «Сцяг брыгады» (1942), «Балады аб чатырох заложніках» (1942). Трагедыйныя аспекты народнага жыцця, змагання з ворагам у творах А. Куляшова «Над брацкай магілай», «Ліст з палону», «Маці» і інш. Сучаснае прачытанне паэмы «Сцяг брыгады», вершаў «Камуністы», «Інтэрнацыянал». «Новая кніга» (1964) як адмаўленне ад спрошчанасці, ілюстрацыйнасці паэзіі 50-х гг. Паварот да філасофскага асэнсавання жыцця. «Касмічная» нізка вершаў А. Куляшова («Адвечны час з нябачных нам дарог...», «Ты згасіш Сонца, час, але не згіне...», «Сама Зямля не вечна — час даводзіць...», «Парушыўшы законы прыцягнення...» і інш.). Асэнсаванне катэгорый Часу, Вечнасці, Жыцця, Смерці ў вершах 60—70-х гг.

Спалучэнне асабістага з агульначалавечым, эмацыянальная «сагрэтасць» вобразаў у творах А. Куляшова («Я хаце абавязаны прапіскаю...», «Мне кожны год, нібы жыццём другім...», «Сасна і бяроза» і інш.).

***Пімен Панчанка*** (1917—1995). Біяграфічныя звесткі. Пачатак літаратурнай дзейнасці. Тэматыка зборнікаў «Упэўненасць» (1938), «Вераснёвыя сцягі» (1940). Рамантычная акрыленасць, паэтызацыя звычайных з'яў штодзённага жыцця, працоўных будняў, метафарычнасць як адметныя рысы творчасці Панчанкі 30-х гг. (вершы «Зажынкі», «Падсочка», «Выязджалі лесарубы», «Адкопаныя зарніцы» і інш.). Узлёт паэзіі П. Панчанкі ў гады вайны. Непадзельнасць лёсу аўтара і лёсу Радзімы. Адзінства тонкага лірызму і гарачага публіцыстычнага пафасу (вершы «Герой», «Коні», «Курганы», «Вясна ідзе на Беларусь», «Сінія касачы» і інш.). Паэтычны вобраз маці-Беларусі ў цыкле «Іранскі дзённік» (1944—1947). Паэма «Маладосць у паходзе» (1945) як завяршэнне ваеннага перыяду ў творчасці пісьменніка. Аўтабіяграфізм, жанравая своеасаблівасць твора. Лірыка 1970—1990 гг.

***Іван Мележ*** (1921—1976). Біяграфія пісьменніка. К. Чорны пра раннія апавяданні І. Мележа. Тэматыка, мастацкія асаблівасці

твораў ваеннага часу. Поспех апавядання «У завіруху». Паэтызацыя стваральнай працы ў аповесці «Гарачы жнівень» (1948). Раман «Мінскі напрамак» (1947—1952), чатыры рэдакцыі твора. Раман І. Мележа ў кантэксце твораў свайго часу, прысвечаных падзеям Вялікай Айчыннай вайны. Выдаткі першага звароту пісьменніка да вялікай эпічнай формы. Вобраз маршала Чарняхоўскага.

Задума «Палескай хронікі»: ад аповесці пра меліярацыю сучаснага Палесся да цыкла раманаў пра лёс народа на драматычных перакрыжаваннях гісторыі. Сімволіка назваў закончаных («Людзі на балоце», 1962; «Подых навальніцы», 1965; «Завеі, снежань», 1976) і незакончаных («За асакою бераг», «Праўда вясны») частак «Хронікі». Узмацненне трагедыйнага пафасу твораў з заглыбленнем пісьменніка ў сутнасць падзей калектывізацыі. Паказ трагедыі селяніна-гаспадара. Адметнасць чалавечых характараў. Псіхалагічнае майстэрства пісьменніка. Тэматычнае, праблемнае, жанравае наватарства раманаў «Палескай хронікі». Месца твора ў літаратуры пра калектывізацыю. Кніга І. Мележа «Жыццёвыя клопаты» (1975). Погляды пісьменніка на творчасць, літаратуру, час.

***Васіль Быкаў*** (1924—2003). Ваенная «адысея» будучага пісьменніка. Літаратурныя настаўнікі. Раннія творы В. Быкава (зб. «Жураўліны крык», «Ход канём», абодва — 1960). Праблемная навізна аповесці «Жураўліны крык» (1959). Погляд на мінулую вайну як на народную трагедыю. Тэматычная шматпланавасць творчасці В. Быкава. Паказ салдата, што змагаецца на фронце («Жураўліны крык». «Трэцяя ракета», «Дажыць да світання», «Яго батальён» і інш.), партызанаў («Круглянскі мост», «Сотнікаў», «Воўчая зграя» і інш.), мірных жыхароў акупіраванай тэрыторыі («Сваякі», «Знак бяды», «У тумане»), суайчыннікаў, якіх ваенны лёс закінуў на чужыну («Альпійская балада», «Пакахай мяне, салдацік»). Зварот пісьменніка ў 80—90-я гг. да трагічных падзей савецкай гісторыі — Слуцкага паўстання, калектывізацыі, рэпрэсій і г. д. («Знак бяды», «Аблава», «Сцюжа», «На чорных лядах», «Перад канцом», «Народныя мсціўцы» і інш.).

***Янка Брыль*** (1917—2006). Факты біяграфіі. Эпічная і лірычная плыні ў ранняй творчасці Я. Брыля (апавяданні «Марыля», «Як маленькі», 1937). Спалучэнне падзейнасці і эмацыянальнай насычанасці ў апавяданнях 50-х гг.: «Маці», «Memento mori», «Галя» і інш. Тонкі псіхалагізм, майстэрства выкарыстання мастацкай дэталі як адметныя рысы Брыля-апавядальніка. Праца над раманам



«Граніца» (1949). Аповесці «У Забалоцці днее» (1951), «На Быстранцы» (1955), «Ніжнія Байдуны» (1975). Тэматыка і праблематыка твораў. Творчая гісторыя рамана «Птушкі і гнёзды» (1964). Жанрава-стылявыя асаблівасці твора. Роздум аўтара над лёсам свайго народа. Тэма дзяцінства ў Я. Брыля, прысутнасць яе ў многіх творах («Птушкі і гнёзды». «Гуртавое», «Золак, убачаны здалёк», 1978, і інш.). Адметнасць мастакоўскай пазіцыі.

***Іван Шамякін*** (1921—2004). Жыццёвы шлях пісьменніка. Наследаванне класічным узорам у першым апавяданні «У снежнай пустыні» (1944). Творчыя знаходкі і пралікі аповесці «Помста» (1945). Праблемна-тэматычнае наватарства рамана «Глыбокая плынь» (1948). Пераключэнне ў канцы 40-х — сярэдзіне 50-х гг. на праблемы мірнага жыцця (апавяданні «Залатыя агні», «Хадакі», «Памылка», «Падмочаны» і інш.; раманы «У добры час», 1952, «Крыніцы», 1957). Даніна тэорыі бесканфліктнасці ў многіх апавяданнях, рамане «У добры час». Маральна-этычныя пошукі герояў пенталогіі «Трывожнае шчасце» (1957—1965). Зварот пісьменніка да асабіста перажытага. Жанрава-стылявая адметнасць аповесцей «Непаўторная вясна», «Агонь і снег», «Мост». І. Шамякін — пачынальнік новых тэм і праблем. Характэрныя рысы рамана І. Шамякіна («Сэрца на далоні», 1963; «Снежныя зімы», 1970; «Атланты і карыятыды», 1974; «Вазьму твой боль», 1978; «Зеніт», 1986). Тэма гарадскога падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў творчасці пісьменніка (раман «Сэрца на далоні», аповесці «Гандлярка і паэт», «Шлюбная ноч», 1976; «Ахвяры», 1990). Творчасць І. Шамякіна ў 80—90-я гг. Імкненне паспець за хуткаплыннай рэчаіснасцю. Творы-водгукі на змены ў жыцці народа (раманы «Петраград — Брэст», «Злая зорка»; аповесці «Драма», «Адна на падмостках», «Сатанінскі тур», «Падзенне», «Палеская мадонна» і інш.).

***Андрэй Макаёнак*** (1920—1982). Факты біяграфіі. Першыя спробы пяра — гумарэскі, сатырычныя замалёўкі. Іх роля ў станаўленні сатырыка-драматурга. Аднаактовыя п'есы («Добра, што добра канчаецца», «Жыццё патрабуе», «Перад сустрэчай» і інш.) як подступы да вялікай драматургіі. А. Макаёнак пра сваю першую п'есу «На досвітку» (1951). Невыпадковасць звароту маладога драматурга да рэчаіснасці капіталістычнай краіны. З'яўленне вострай праблемнай камедыі «Выбачайце, калі ласка» (1953). Месца камедыі ў літаратуры 50-х гг. Жыццё калгаснай вёскі ў п'есах канца 50-х — пачатку 70-х гг. («Каб людзі не журыліся»,

1958; «Лявоніха на арбіце», 1961; «Таблетку пад язык», 1973). Змена танальнасці твораў — ад сатырычнай да лірычнай камедыі. Наватарства А. Макаёнка. Зварот да трагікамедыі, выкарыстанне сродкаў тэатральнай умоўнасці, элементаў фантастыкі і г. д. («Зацюканы апостал», 1969; «Кашмар», 1974; «Дыхайце эканомна», 1982). Арыгінальнасць аўтарскага вызначэння жанру, назваў частак твора, кампазіцыйнай пабудовы («Трыбунал», 1970; «Верачка», 1979; «Пагарэльцы», 1980 і інш.). Разнастайнасць тэматыкі твораў драматурга. Скіраванасць п'ес супраць заганных з'яў у жыцці народа і чалавечай цывілізацыі. Даніна часу ў творах А. Макаёнка.

***Уладзімір Караткевіч*** (1930—1984). Неардынарнасць асобы мастака. Гарачая любоў да свайго, роднага і павага, шчырая цікавасць да чужога. Шырокая эрудыцыя. Набыткі пісьменніка ў паэзіі, прозе, драматургіі, публіцыстыцы. У. Караткевіч — заснавальнік гістарычнага жанру ў беларускай літаратуры. Паэтызацыя і рамантызацыя мінулага беларусаў, вобраза народа («Беларуская песня», «Сівая легенда», «Маці Урагану» і інш.). Вялікае жаданне пісьменніка адкрыць суайчыннікам саміх сябе, вярнуць ім адчуванне нацыянальнай годнасці, гістарычную памяць. Рысы рамантызму ў творчасці. Зварот да паданняў і легенд, да жанру балады. Творчая гісторыя рамана «Каласы пад сярпом тваім» (1965—1968). Шляхта і народ у творы. Рэальныя падзеі і канкрэтныя гістарычныя асобы ў рамане. Выкарыстанне сімвалічных вобразаў. Вобраз Каліноўскага ў творчасці пісьменніка («Каласы пад сярпом тваім»; драма «Кастусь Каліноўскі», 1978; верш «Нявесце Каліноўскага»). Жанравае ўзбагачэнне беларускай літаратуры У. Караткевічам: філасофская балада, філасофская аповесць, дэтэктыўны і прыгодніцкі раман і г. д. Традыцыі У. Караткевіча ў сучаснай беларускай літаратуры.

***Іван Чыгрынаў*** (1934—1996). Пошукі няпростых жыццёвых сітуацый і чалавечых характараў у ранніх творах (апавяданні «Праз гады», «У ціхім тумане», «Усцінія»). Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў творчасці празаіка. Раманны цыкл І. Чыгрынава — «Плач перапёлкі» (1972), «Апраўданне крыві» (1977), «Свае і чужыя» (1984), «Вяртанне да вайны» (1994). Новыя аспекты ваеннай тэмы ў творах. Ідэйна-мастацкая адметнасць заключнай часткі цыкла — рамана «Не ўсе мы згінем» (1996). Сучаснасць і далёкая гісторыя краіны ў п'есах І. Чыгрынава «Чалавек з мядзвежым тварам», «Звон — не малітва», «Следчая справа Вашчылы» і інш.



***Наталля Арсеннева*** (1903—1997). Ранні перыяд творчасці. Элегічна-філасофская настроенасць зборніка «Пад сінім небам» (1927). Месца Н. Арсеневай у заходнебеларускай паэзіі. Змены ў творчасці, выкліканыя падзеямі Вялікай Айчыннай вайны. Н. Арсеннева пра месца мастацтва ў разбураным вайной свеце («Сягоння», «Пясняр», «Не хочацца», «З выраю» і інш.). Ідэя незалежнай Беларусі ў вершах 40—50-х гг. («Асенняя дарога», «Жыве Беларусь», «І сніцца мне», «Развітанне»). «Закрытасць» мастацкага свету Н. Арсеневай перад чужой рэчаіснасцю. Сканцэнтраванасць на сваім, родным, хоць і страчаным (зборнік «Між берагамі», 1979). Жанрава-стылявая адметнасць твораў. Зварот да народных першаасноў жыцця, да фальклору.

***Ларыса Геніюш*** (1910—1983). Старонкі жыцця Л. Геніюш па кнізе «Споведзь» (1993). Жанравыя асаблівасці твора, гісторыя публікацыі.

Роздум над лёсам акупіраванай чужынцамі Бацькаўшчыны (зб. «Ад родных ніў», 1942). Зварот да гістарычнага мінулага («Ефрасіння Полацкая», «Князь Усяслаў Чарадзей», «Скарына», паэма «Даўніна» і інш.). Шматграннасць вобраза Радзімы ў лірыцы Л. Геніюш. Паэтызацыя сялянскага ўкладу жыцця, народных звычаяў, працы («Дыван», «Чысціня», паэма «Куфар»). Фальклорныя традыцыі ў творчасці Л. Геніюш. Аналіз вершаў, напісаных у сталінскіх лагерах («Мы — народ», «Стукачы», «Замерзлымі пальцамі», «На магілу З. К.», «Не знаю», «Востры боль пранізаў наваколле...», «Гнаны холадам...» і інш.). Духоўная нязломнасць лірычнай гераіні.

***Сяргей Грахоўскі*** (1913—2002). Дакументальна-мастацкая трылогія («Зона маўчання», «З воўчым білетам», «Такія сінія снягі») пра два дзесяцігоддзі пакут і выпрабаванняў. Тэма рэпрэсій і чалавечай мужнасці, духоўнай няскоранасці ў паэме «Балючая памяць» (1987), вершах 80—90-х гг. («Страчаная маладосць», «Грузчык сорак першага года», «Гісторыя» і інш.). Тэматычная і жанравая разнастайнасць творчасці С. Грахоўскага.

## Літаратура канца XX — пачатку XXI стагоддзя
(2 гадзіны)

Зрухі ў грамадска-палітычным жыцці ў другой палове 80-х гг. XX ст. Сучасная беларуская літаратура на шляху разнастайных мастацкіх пошукаў. Прыход у літаратуру новых творчых пакаленняў.

Утварэнне грамадскага аб'яднання «Саюз пісьменнікаў Беларусі». Літаратурна-мастацкая перыёдыка.

***Сучасная паэзія***. Паглыбленне агульначалавечага, маральна-філасофскага, гуманістычнага зместу лірыкі, яе грамадзянска-публіцыстычнага і інтымна-псіхалагічнага пачаткаў у творчасці Ю. Свіркі, Д. Бічэль, Г. Пашкова, М. Пазнякова, А. Салтука, У. Карызны, М. Дуксы, Л. Галубовіча, З. Марозава, А. Глобуса, А. Разанава і інш.

***Сучасная проза***. Сацыяльныя і маральна-філасофскія праблемы ў сучаснай прозе. Чарнобыльская тэма, тэма Вялікай Айчыннай вайны, тэма гістарычнага мінулага (А. Жук, А. Федарэнка, А. Казлоў, Л. Левановіч, Г. Марчук, Л. Дайнека, В. Коўтун і інш.).

***Сучасная драматургія***. Узмацненне ўвагі беларускіх аўтараў да сусветнага драматургічнага і тэатральнага мастацтва. Звесткі аб стане сучаснага тэатра і яго рэпертуары.

Вострыя надзённыя праблемы жыцця ў п'есах М. Матукоўскага («Мудрамер», 1987; «Бездань», 1992), А. Петрашкевіча («Куды ноч, туды сон», 1988) і інш. Зварот пісьменнікаў у пошуках адказаў на сённяшнія пытанні да нядаўняй і далёкай гісторыі («Прарок для Айчыны» А. Петрашкевіча, 1990; «Страсці па Аўдзею» У. Бутрамеева, 1990). Ажыўшыя старонкі гісторыі ў творах А. Дударава «Купала» (1994), «Рагнеда», «Чорная панна Нясвіжа» (2000) і інш.



# ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Арочка, М.* Беларуская савецкая паэма / М. Арочка. — Мінск, 1979.

*Беларускія* пісьменнікі : біябібліягр. слоўнік: у 6 т. — Мінск, 1992—1995.

*Бельскі, А.* Сучасная беларуская літаратура: Станаўленне і развіццё творчых індывідуальнасцей (80—90-я гг.) / А. Бельскі. — Мінск, 1997.

*Васючэнка, Г. І.* Сучасная беларуская драматургія: дапам. для настаўнікаў / Г. І. Васючэнка. — Мінск, 2000.

*Гарэцкі, М.* Гісторыя беларускай літаратуры / М. Гарэцкі. — Мінск, 1992.

*Гісторыя* беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. — Мінск, 1999—2002.

*Гісторыя* беларускай літаратуры: XIX — пачатак XX ст. / пад агул. рэд. М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча. — 2-е выд., дапрац. — Мінск, 1998.

*Гісторыя* беларускай літаратуры: XX стагоддзе (20—50-я гады) / пад агул. рэд. М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча. — 2-е выд., дапрац. і дап. — Мінск, 2000.

*Гісторыя* беларускай літаратуры: Старажытны перыяд / пад агул. рэд. М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча. — 2-е выд., дапрац. — Мінск, 1996.

*Мішчанчук, М.* Беларуская літаратура XX ст.: вучэб. дапам. / М. Мішчанчук, І. Шпакоўскі. — Мінск, 2001.

*Саверчанка, І.* Старажытная паэзія Беларусі: XVI — першая палова XVII стагоддзя / І. Саверчанка. — Мінск, 1992.

*Шаўлоўская, М.* Беларуская драматургія / М. Шаўлоўская. — Мінск, 1981.

*Янка* Купала: энцыкл. давед. — Мінск, 1986.

*Ярош, М.* Беларуская савецкая лірыка / М. Ярош, В. Бечык. — Мінск, 1979.

## Інтэгральная дзесяцібальная шкала ацэнкі вучэбнай дзейнасці навучэнцаў па дысцыпліне «Гісторыя беларускай літаратуры»

| Адзнака ў балах | Паказчыкі адзнакі |
|---|---|
| **I узровень. Прадстаўленне** | |
| **1 (адзін) — незалічана** | Адсутнасць ведаў і кампетэнцыі ў межах адукацыйнага стандарту ці адмаўленне ад адказу.<br>Вельмі скаваная мова |
| **2 (два) — незалічана** | Фрагментарныя веды ў рамках адукацыйнага стандарту.<br>Веданне асобных літаратурных крыніц, рэкамендаваных вучэбнай праграмай дысцыпліны.<br>Няўменне выкарыстоўваць навуковую тэрміналогію дысцыпліны, наяўнасць у адказах грубых стылістычных і лагічных памылак.<br>Скаваная мова |
| **3 (тры) — незалічана** | Недастатковы аб'ём ведаў у межах адукацыйнага стандарту.<br>Веданне часткі асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны.<br>Выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, адказы на пытанні з істотнымі стылістычнымі і лагічнымі памылкамі.<br>Слабае валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, некампетэнтнасць у вырашэнні стандартных (тыпавых) задач.<br>Няўменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках вывучаемай дысцыпліны.<br>Некалькі скаваная мова |
| **II узровень. Разуменне** | |
| **4 (чатыры) — залічана** | Дастатковы аб'ём ведаў у межах адукацыйнага стандарту.<br>Засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны.<br>Валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць у вырашэнні стандартных (тыпавых) задач.<br>Уменне пад кіраўніцтвам выкладчыка вырашаць стандартныя (тыпавыя) задачы.<br>Уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках і даваць ім ацэнку.<br>Мова невыразная |
| **5 (пяць)** | Дастатковыя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы дысцыпліны.<br>Выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, стылістычна граматныя і лагічна правільныя адказы на пытанні, уменне рабіць высновы.<br>Валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць у вырашэнні вучэбных і прафесійных задач.<br>Здольнасць самастойна прымяняць тыпавыя рашэнні ў рамках вучэбнай праграмы.<br>Засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны.<br>Работа на практычных занятках, удзел у групавых абмеркаваннях пытанняў курса, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.<br>Мова эмацыянальная, але недастаткова выразная |
| **III узровень. Прымяненне** | |
| **6 (шэсць)** | Дастаткова поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы курса.<br>Выкарыстанне неабходнай навуковай тэрміналогіі, стылістычна і лагічна правільныя |

| | |
|---|---|
| | адказы на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы.<br>Валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць у вырашэнні вучэбных і прафесійных задач.<br>Здольнасць самастойна прымяняць тыпавыя рашэнні ў рамках вучэбнай праграмы курса.<br>Уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і кірунках па дысцыпліне і даваць ім параўнальную ацэнку.<br>Мова эмацыянальная і выразная |
| **7 (сем)** | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах курса ў аб'ёме вучэбнай праграмы.<br>Выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, стылістычна і лагічна правільныя адказы на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы.<br>Валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць у пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач.<br>Засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры па курсе, якая рэкамендавана вучэбнай праграмай.<br>Уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках па дысцыпліне і даваць ім крытычную ацэнку.<br>Мова эмацыянальная і выразная |
| **8 (восем)** | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах курса ў аб'ёме вучэбнай праграмы.<br>Выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, стылістычна граматныя, лагічна правільныя адказы на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы. |



| | |
|---|---|
| | Валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго эфектыўна выкарыстоўваць у пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач.<br>Здольнасць самастойна вырашаць складаныя праблемы ў межах вучэбнай праграмы.<br>Засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры па курсе, якая рэкамендавана вучэбнай праграмай.<br>Уменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па дысцыпліне і даваць ім крытычную ацэнку з пазіцыі дзяржаўнай ідэалогіі.<br>Мова добра развітая, эмацыянальная і выразная |
| **IV узровень. Творчасць (перанос)** | |
| **9 (дзевяць)** | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах курса.<br>Дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, стылістычна граматныя і лагічна правільныя адказы на пытанні.<br>Валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго эфектыўна выкарыстоўваць у пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач.<br>Самастойнае і творчае вырашэнне складаных праблем у нестандартных сітуацыях.<br>Поўнае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры па курсе, якая рэкамендавана вучэбнай праграмай.<br>Уменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па дысцыпліне і даваць ім крытычную ацэнку.<br>Мова эмацыянальная і выразная |
| **10 (дзесяць)** | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах курса, а таксама па асноўных пытаннях, якія выходзяць за межы курса. |

| | |
|---|---|
| | Дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, стылістычна і лагічна правільныя адказы на пытанні.<br>Бездакорнае валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго эфектыўна выкарыстоўваць у пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач.<br>Здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартных сітуацыях.<br>Поўнае і глыбокае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры па курсе, якая рэкамендавана вучэбнай праграмай дысцыпліны.<br>Здольнасць арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па дысцыпліне і даваць ім крытычную ацэнку, выкарыстоўваць навуковыя дасягненні сумежных дысцыплін.<br>Мова эмацыянальная і выразная |

*Заўвага*: Адзнака «0» (нуль) выстаўляецца навучэнцу пры адмаўленні ад адказу без уважлівай прычыны, пры невыкананні ім вучэбнай праграмы дысцыпліны.



*Вучэбнае выданне*

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

ТЫПАВАЯ ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА
для ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў галіне культуры і мастацтва па спецыяльнасці 2-17 01 01 «акцёрскае мастацтва»

Укладальнік *Грушэўскі Мікалай Мікалаевіч*

Адказны за выпуск *С. М. Рыбарава*

Выпускаючы рэдактар *І. А. Кашэўская*

Рэдактар *Р. А. Маслоўская*
Макет і вёрстка *Ю. В. Шабан*

ПРАГРАМА

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

МІНСК 2010